

**Законы на роднай мове**

СТАР. 2



**Цікавінкі Фэсту экскурсаводаў — 2018**

СТАР. 9



**Хобі студэнта ператварылася ў музей**

СТАР. 13

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

21 КРАСАВІКА 2018 г. СУБОТА № 76 (28692)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Супрацоўніцтва

## Куба — побач

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мігеля Дыяса-Канеля з абраннем на пасаду Старшыні Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба, паведамілі газеце «Звязда» ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Упэўнены, што здолееце захаваць і прымножыць дасягненні рэвалюцыі, стаць надзейнай апорай для гераічнага кубінскага народа ў абароне яго інтарэсаў, паспяхова адстойваць на міжнароднай арэне права краіны на самастойнае развіццё», — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт падкрэсліў, што паміж Беларуссю і Кубай склаліся асаблівыя, саюзніцкія адносіны. «Перакананы, што стратэгічнае двухбаковае супрацоўніцтва, якое дынамічна пашыраецца, мае велізарны патэнцыял. Сумеснымі намаганнямі мы дасягнём яшчэ больш высокіх вынікаў у палітычнай, гандлёва-эканамічнай і іншых сферах узаемадзеяння», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама адрасаваў віншавальнае пасланне Першаму сакратару Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кубы Раулю Кастра Русу, у якім павіншаваў яго і кубінскі народ з паспяховым завяршэннем электаральнага працэсу і абраннем новага кіраўніка дзяржавы. «Вынікі выбараў ярка прадэманстравалі безумоўную падтрымку грамадзянамі палітычнага курсу, заснаванага на ідэалах кубінскай рэвалюцыі», — падкрэсліў беларускі лідар.

**Ул. інф.**

■ Парламенцкі дзённік

## ДЭПУТАЦКАЯ ТАЛАКА

### Народныя абраннікі прынялі ўдзел у акцыі «Тыдзень лесу»



**Напярэдадні рэспубліканскага суботніка дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на тэрыторыі Плешчаніцкага лясніцтва паказалі, як працаваць талакой. Задача была засадзіць дзялянку ў тры гектары 15 тысячамі сосен і бяроз. Акцыя ўжо стала традыцыйнай.**

— Для лясной галіны вельмі важна лесааднаўленне і лесаўзнаўленне. Такія «тыдні лесу» — прапаганда сярод дзяржаўных служачых, супрацоўнікаў розных устаноў, рэлігійных, грамадскіх арганізацый і звычайных грамадзян па ўсёй краіне. Мэта акцыі — паказаць не толькі тое, што лес — наша багацце, але і што ён мае патрэбу ў абароне і ахове, — сцвярджае **Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.**

На думку дэпутатаў, пасадзіць лес — толькі пачатак справы. Важная праца, якая ўскладзена на лесаводаў, — дагледзець дрэвы і іншыя лясныя культуры. Таму адна з задач акцыі: дапамагчы працаўнікам лясной галіны і выказаць ім сваю павагу.

Рэспубліканская акцыя «Тыдзень лесу», арганізатарам якой стала Міністэрства лясной гаспадаркі, прымеркавана да Года малой радзімы.

— Многае ўжо рэалізавана ў сельскай мясцовасці — і праграма аграгарадкоў, і адраджэння вёскі, — адзначыў **Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў.** — Прыйшла вялікая механізацыя, прыйшлі буйнатаварныя вытворцы — і насельніцтва засталося без ручной працы. Гэта, з аднаго боку, плюс, аблягчэнне, а з другога — мінус, бо вельмі мала засталося працоўных месцаў. Таму нам усім разам трэба стварыць умовы, пры якіх нашы маладыя людзі будуць заставацца ў вёсцы.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Хто на полі гаспадар?





У адным з паўднёвых раёнаў Гомельскай вобласці — Хойніцкім — прыступілі да сяўбы кукурузы. У КСУП імя І. Мележа пад гэтую культуру ў бягучым годзе адведзена 1,92 тыс. га, 150 з якіх — на насенне. У гэтыя спрыяльныя вясновыя дні на сяўбе шчыруе і механізатар Раман РАМАЗАЎ.

Фота БелТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Адной з ключавых праблем прамысловых прадпрыемстваў рэгіёна сёння стаў дэфіцыт кадраў. Прамысловасць набірае абароты, ёсць прырост вытворчасці, і для далейшага развіцця патрэбны кадры. Зараз павышаны попыт на прафесіяналаў. Ключавыя задачы для вытворчасці — аптымізацыя выдаткаў, зніжэнне сабекошту. У іх вырашэнні роля кадраў вельмі высокая. Толькі высокапрафесійныя спецыялісты здольныя стварыць эфектыўную вытворчасць. Іх трэба мэтанакіравана рыхтаваць сумеснымі намаганнямі прадпрыемстваў і ўстаноў адукацыі».*

■ Узровень камфорту

## ЯК НЕ «ЗГАРЭЦЬ» НА РАБОЦЕ

### І ЧАМУ ГРОШЫ НЕ ЗАЎСЁДЫ МАТЫВУЮЦЬ

**40 гадзін на тыдзень мы праводзім на рабоце. А з улікам часу, патрачанага на праезд і размовы пра тое, як прайшоў працоўны дзень, і таго больш. Ці павінна работа прыносіць задавальненне, як правільна выбраць прафесію, чаму адбываецца эмацыянальнае выгаранне і ці існуюць ідэальныя кіраўнікі, гутарым з псіхолагам і кансультантам па персанале Арсеніем ВАЛАДЗЬКО.**

#### У стрэсе мы не бачым альтэрнатыў

***— Чаму мы так баімся страціць работу?***

— Гэты страх — адгалосак куды больш старажытнага страху смерці. Бо страціць работу ў нашым уяўленні — гэта застацца без сродкаў да існавання. Памятаю, адна кліентка, калі звальнялася, а новай прапановы яшчэ не паступіла, вельмі перажывала. А яна не мінчанка, ёй трэба было здымаць жыллё. Жанчыну падтрымала такая простая сітуацыя: яна спусцілася ў краму на першым паверсе свайго дома і ўбачыла аб'яву аб тым, што патрабуецца прыбіральшчыца. І таго заробку хапіла б, каб плаціць за здымную кватэру.

Калі мы знаходзімся ў стрэсавай сітуацыі, то бачым яе ў вузкім дыяпазоне і не разглядаем альтэрнатыў. Чалавек, напрыклад, вызначыў, што яму падыходзіць толькі такая вакансія, і калі яму яе не прапануюць, то ўсё — выйсця няма. Але ж работы хапае.

Страх грунтуецца на тым, што мы не хочам страціць пэўны ўзровень камфорту. Хоць, як паказвае практыка, вельмі хутка прыстасоўваемся да меншага даходу. Так, давядзецца ад многага адмовіцца, але гэта магчыма.

***— Якія памылкі мы дапускаем пры пошуку працы?***

— Многія не вельмі разумеюць, якая работа ім падыходзіць. Мы свой прафесійны шлях выбіраем у маласвядомым узросце. Часта гэта рашэнне прадыктаваны чым пажадаеце, толькі не інтарэсамі самога чалавека, або ўяўленні аб будучай прафесіі вельмі далёкія ад рэальнасці.

СТАР. 2

■ Добрая справа

## Працуем, зарабляем, пералічваем

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2018 г. № 276 «Аб правядзенні рэспубліканскага суботніка ў 2018 годзе» грашовыя сродкі, заробленыя ў дзень правядзення рэспубліканскага суботніка, у тым ліку на працоўных месцах, у аб'ёмах, вызначаных добраахвотна работнікамі, уключаючы работнікаў, дзейнасць якіх не звязана з вытворчасцю прадукцыі (работ), аказаннем платных паслуг, пералічваюцца праз раённыя і гарадскія выканаўчыя камітэты ў аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам.

Для залічэння грашовых сродкаў, заробленых на рэспубліканскім суботніку 2018 года, паведамляем рэквізіты асобнага банкаўскага рахунку Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь:

Бенефіцыяр — Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь;

УНП бенефіцыяра — 100691903;

Нумар рахунку — BY31NBRB36409000001050000000 у беларускіх рублях;

Банк — Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, г. Мінск;

БІК банка — NBRBBY2X.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МІНФІН ЗША: САНКЦЫІ СУПРАЦЬ РАСІІ ДАСЯГНУЛІ ПАТРЭБНАГА ВАШЫНГТОНУ ВЫНІКУ

Адміністрацыя прэзідэнта ЗША Дональда Трампа мяркуе, што апошнія антырасійскія санкцыі дасягнулі жаданага Вашынгтонам эфекту, амерыканская стратэгія ў гэтай сферы будзе пастаянна карэктавацца, у тым ліку ў залежнасці ад канфідэнцыяльных фактараў. Пра гэта заявіў учора міністр фінансаў ЗША Стывен Мнучын у эфіры тэлеканала Fox News. «Санкцыі, якія мы ўвялі ў дачыненні да алігархаў і расійскіх палітыкаў, мелі неабходны эфект», — дадаў міністр. «Як казаў прэзідэнт, мы гатовыя быць вельмі жорсткімі ў дачыненні да Расіі, мы ўжо гэта рабілі», — сказаў Мнучын. Кіраўнік мінфіна ЗША пагадзіўся з ацэнкай адносна таго, што «дадзеныя санкцыі ў дачыненні да Расіі былі больш дзейснымі, чым якія-небудзь да іх».

### TIME АПУБЛІКАВАЎ ТОП-100 САМЫХ УПЛЫВОВЫХ ЛЮДЗЕЙ СВЕТУ

Амерыканскае выданне Time склала свежы рэйтынг топ-100 самых уплывовых людзей свету. Спіс апублікаваны на сайце часопіса. Рэйтынг Time не прысвойвае пэўныя месцы, але падзяляе сотню самых уплывовых людзей планеты на катэгорыі: «наватары», «лідары», «мастакі», «іконы» і інш. У катэгорыі «лідары» прадстаўлены Дональд Трамп, Эмануэль Макрон, Сі Цзіньпін, Кім Чэн Ын. Таксама ў гэтую катэгорыю трапілі прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо, прынц Вялікабрытаніі Гары са сваёй нявестай Меган Маркл і інш. Сярод самых уплывовых дзеячаў мастацтваў названыя актрысы Ніколь Кідман, Галь Гадот, акцёр Х'ю Джэкман, рэжысёры Гільерма дэль Тора і Грэта Гервіг, тэлевядучы Джымі Кімел і іншыя. Таксама трапілі ў спіс тэлевядучая Опра Уінфры і вынаходнік Ілан Маск. Акрамя таго, у рэйтынгу фігуруе падлетак: 14-гадовая актрыса Мілі Бобі Браўн, якая выканала ролю дзяўчынкі Ілевен у серыяле «Вельмі дзіўныя справы». Сярод «наватараў» — камедыйная актрыса Тыфані Хедыш, рэп-спявачка Cardi B, алімпійская чэмпіёнка Хлоі Кім. У спіс увайшлі таксама швейцарскі тэнісіст Роджэр Федэрэр, індыйскі гулец у крыкет Вірат Кахлі, амерыканскія фігурыст Адам Рыпон і баскетбаліст Кевін Дзюрант, гулец «Х'юстана» Джэй Джэй Уот.

ISSN 1990 - 763X

### КАРОЛЬ СВАЗІЛЕНДА ПЕРАНАЗВАЎ СВАЮ КРАІНУ



Паўднёваафрыканскае каралеўства Свазіленд змяніла назву. Рашэнне аб афіцыйным перайменаванні краіны прыняў кароль Мсваці III з-за падабенства англійскіх назваў Свазіленда (Swaziland) і Швейцарыі (Switzerland). Адзначаецца, што цяпер дзяржава вярнулася да сваёй гістарычнай назвы — Каралеўства Эсваціні (Kingdom of eSwatini), што ў перакладзе з мясцовай мовы сваці азначае «Зямля сваzі». Заява аб перайменаванні прагучала падчас святочнай цырымоніі з нагоды 50-годдзя Мсваці III, а таксама 50-годдзя незалежнасці дзяржавы. «Многія афрыканскія краіны пасля атрымання незалежнасці вярнуліся да сваіх старажытных, родных найменняў», — сказаў кароль Мсваці III. Ён таксама ўказаў, што з-за старой назвы дзяржавы часта адбываліся непаразуменні: «Кожны раз, калі мы выязджаем за мяжу, людзі думаюць, што мы са Швейцарыі». Гістарычную назву каралеўства Мсваці III раней ужо выкарыстоўваў падчас сваіх выступленняў. Назву «Эсваціні» кароль агучваў, у прыватнасці, падчас прамовы на Генеральнай асамблеі ААН у 2017 годзе, падчас саміту Афрыканскага саюза, а таксама на іншых міжнародных канферэнцыях.

### КОРАТКА

Нацыянальны гістарычны музей Беларусі абвясціў збор дзіцячых кніжак на беларускай мове для дыяспары. Усе ахвотныя могуць прынесці кнігі на беларускай мове ў музей да 29 красавіка. Яны будуць перададзеныя для дзетак-беларусаў Польшчы, Літвы і Латвіі.

**Раннія яравыя ў Беларусі пасеяны больш чым на 40 % плошчаў. Сёлета пад іх плануецца заняць 1,019 млн га.**

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 9 мая з 5 мая пачнецца ў аддзяленнях паштовай сувязі Мінска; з 7 мая — у АПС Магілёва, у гарадскіх АПС Брэсцкай вобласці; 8 мая — ва ўсіх АПС Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей, у сельскіх АПС Брэсцкай вобласці.

**Гарачае водазабеспячэнне ў Мінску пачнуць адключаць з 2 мая.**

■ Мегаполіс

## МОЙ ДОМ — МАЯ КРЭПАСЦЬ

### Якая будучыня ў сядзібных участкаў сталіцы?

**Каля дамоў узвышаюцца пладавітыя яблыні, паабапал тратуараў цягнуцца каляровыя стужкі кветак, загарадзь абвівае вінаградная лаза, а дзесьці чуваць бадзёры голас пеўня. Цяжка ўявіць, што такі пейзаж характэрны для мегаполіса. Але гэта — рэчаіснасць сучаснага Мінска, дзе шматпавярховыя дамы суседнічаюць з сядзібнымі ўчасткамі. Лёс гэтых аазісаў сярод жалезабетонных джунгляў неаднойчы станавіўся прычынай разладу горадабудаўнікоў і домаўласнікаў. Як сёння жыве прыватны сектар Мінска, разбіралася карэспандэнт «Звязды».**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Сядзібныя забудовы ў мікрараёне Пятроўшчына.**

#### ВОСЬ ГЭТАЯ ВУЛІЦА, ВОСЬ ГЭТЫ ДОМ

Сядзібныя ўчасткі займаюць амаль пятую частку сталіцы. На тэрыторыі каля 1560 га размяшчаюцца больш за 16 тысяч прыватных дамоў. У іх пражываюць 108 тысяч чалавек. Самы багаты на прыватны сектар Цэнтральны раён — на 300 га размяшчаюцца 2700 дамоў. На другім месцы — самы працавіты, Заводскі, дзе на 280 га прыходзіцца больш за 3400 сядзіб. Забудова там больш шчыльная, а плошчы ўчасткаў значна меншыя, таму і выходзіць такая розніца.

Частка сённяшняй сядзібнай забудовы — гэта нашчадкі былых вёсак Сухарава, Кунцаўшчыны, Масюкоўшчыны, Лошыцы, якія размяшчаліся вакол Мінска. Работнікамі буйных прадпрыемстваў у савецкія часы былі пабудаваны пасёлак Аўтазавода, Грушаўка.

СТАР. 2

# «Зялёная» будучыня

## Перспектыўнымі сферамі дзейнасці стануць энергетыка і арганічная гаспадарка

**Такое меркаванне выказаў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА падчас II Міжнароднага форуму «Прафсаюзы і «зялёныя» працоўныя месцы», які праходзіў у Мінску. Удзельнікамі мерапрыемства сталі дэлегаты з 38 краін.**

— Апошнія 150 гадоў сусветная эканоміка развівалася за кошт бескантрольнага спажывання прыродных рэсурсаў, і мы сёння бачым, што яны вычэрпваюцца. Гэта прыводзіць да змен у клімаце, зніжэння сацыяльна-эканамічнай абароненасці мільёнаў людзей. Некаторыя галіны на мяжы знікнення — рыбалоўства, лесанарыхтоўка, перапрацоўка рэсурсаў. Будучыня за зялёнай эканомікай, якая скіравана на эфектыўнае выкарыстанне прыродных багаццяў. Яна дае магчымасці для стварэння новых працоўных месцаў у энергетыцы, сельскай гаспадарцы, машынабудаванні, — заўважыў Міхаіл Орда.

Сённяшнія змены адзначаюць, што многім работнікам давядзецца перакваліфікавацца. «Мы павінны забяспечыць лёгкі пераход у новыя сферы эканомікі, — кажа старшыня ФПБ. — І практыка паказвае, што гэта магчыма. Адзін з прыкладаў — Кітай, дзе за кароткі перыяд з галіны лесанарыхтоўкі было вызвалена больш за мільён чалавек. Большасць з іх удалося перанавучыць, уладкаваць на падобныя спецыяльнасці».

**Намеснік міністра працы і сацабароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ** заўважыў, што «зялёныя» працоўныя месцы павінны характарызавацца не толькі экалагічнай бяспекай, але і прадукцыйнай занятасцю, адэкватнай аплатай, гарантыяй захавання рэжыму працоўнага часу і належнай сацыяльнай абаронай.

На форуме абмяркоўвалася таксама праблема вытворчага траўматызму. Па звестках Міжнароднай арганізацыі працы, штогод з-за неналежных умоў на рабоце ў свеце гіне больш за два мільёны чалавек. У нашай краіне ў вырашэнні гэтай праблемы ўдалося дасягнуць станоўчага выніку.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# Згадаем Мараварскую роту

**21—22 красавіка ў 5-й асобнай брыгадзе спецыяльнага прызначэння адбудзецца адкрыты турнір па баявым панкратыёне. Гэта грамадзянская версія ваенна-прыкладнога адзінаборства — армейскага рукапашнага бою. Прыняць удзел у ім могуць дзеці і юнакі дапрызыўнага ўзросту. Турнір прысвечаны Дню памяці Мараварскай роты.**

Дарэчы, 20 красавіка 1985 года 1-я рота 500-га асобнага спецыяльнага атрада спецыяльнага прызначэння рушыла з афганскага Асадабада да паромнай пераправы цераз раку Кунар, атрымаўшы заданне прачасаць кішлак Сангам, які знаходзіўся ў Мараварскай цясніне. Разведчыкаў акружылі маджахеды. З 85 байцоў пад шквальным агнём загінуў 31. Сямёра, не жадаючы здавацца ў палон, падарвалі сябе штурмавой гранатай. Падмога здолела прарвацца праз міны толькі ў другой палове дня 21 красавіка.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Мова закона

## Наколькі забяспечана роўнасць заканадаўства па-руску і па-беларуску?

**Двухмоўе — гэта звыклая для сучасных пакаленняў беларусаў рэальнасць, у якой наша краіна знаходзіцца яшчэ з савецкіх часоў. Сітуацыя не ўнікальная, бо ў дзясятках іншых рэспублік па ўсім свеце афіцыйна замацавана больш чым адна дзяржаўная мова. Аднак галоўнае пытанне, якое ўзнікае, — наколькі ў прынцыпе магчыма абсалютная роўнасць моў не толькі ў побытавай сферы, але і, напрыклад, у прававой? Пра тое, якія праблемы існуюць у айчынным заканадаўстве на беларускай мове і як іх варта вырашаць, ішла гутарка падчас круглага стала, арганізаванага ў Палацы прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**



Фота БелТА.

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы,** лічыць, што самая вялікая праблема — у тым, як забяспечыць роўнасць функцыянавання абедзвюх дзяржаўных моў. Руская і беларуская маюць аднолькавы прававы статус, таму чыноўнікі, лічыць парламентарый, могуць выкарыстоўваць любую з іх. Унясенне праектаў законаў у Палату прадстаўнікоў, іх разгляд і прыняцце могуць ажыццяўляцца таксама на любой з моў. Па словах дэпутата, мову падрыхтоўкі і ўнясення законапраектаў вызначае суб'ект права заканадаўчай ініцыятывы. Таму ніжняя палата парламента разглядае праект закона на той мове, на якой ён унесены.

Старшыня Пастаяннай камісіі прапанаваў некалькі варыянтаў, як аптымальна можна выкарыстоўваць абедзве дзяржаўныя мовы, зыходзячы з замежнага вопыту. Па-першае, гэта можа быць унясенне, падрыхтоўка і прыняцце праектаў нарматыўных прававых актаў адначасова на дзвюх дзяржаўных мовах. Па-другое, прыняцце нарматыўнага прававога акта на адной дзяржаўнай мове з яго наступным афіцыйным перакладам і апублікаваннем на дзвюх мовах. «Абодва варыянты могуць быць рэалізаваны, але які з іх больш прадукцыйны і найменш затратны, — трэба высветліць. Тут у мяне няма адназначнага адказу. У любым выпадку прыняцце і апублікаванне нарматыўных прававых актаў на дзвюх дзяржаўных мовах будзе патрабаваць выдзялення адпаведных бюджэтных сродкаў, што можа адбыцца пры ўмове папярэдняга ўзгаднення пытання з кіраўніком дзяржавы», — адзначыў дэпутат.

«Калі наспеў час прымаць законы на рускай і беларускай мовах — калі ласка. Няма ніякіх перашкод. Рыхтуйце праекты законаў і іншых нарматыўных актаў на абедзвюх мовах», — выказаўся **Рыгор ВАСІЛЕВІЧ, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, загадчык кафедры канстытуцыйнага права БДУ.** На яго думку, тут больш пытанняў у менталітэце, у звыклых падыходах, чым у хібах у заканадаўстве. Напрыклад, першымі крокамі, каб забяспечыць выкарыстанне абедзвюх дзяржаўных моў, могуць стаць правядзенне адной сесіі парламента на беларускай мове, другой — на рускай. І тады няхай усе законапраекты паступаюць на адпаведнай мове. «Калі атрымаецца адразу на дзвюх мовах — калі ласка», — кажа член-карэспандэнт.

«Я лічу, што прававых перашкод ніякіх няма. Трэба пачынаць з таго, што дзяржаўныя служачыя павінны выконваць тыя патрабаванні, якія ёсць у законе аб дзяржаўнай службе, — валодаць дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь. І рускай, і беларускай», — падкрэсліў вучоны. Акрамя таго, ён прапанаваў здаваць экзамен на веданне рускай і беларускай моў усім, хто збіраецца стаць дзяржаўным служачым. Пры атрыманні грамадзянства, лічыць навуковец, таксама было б няблага здаваць спрошчаны, але ўсё ж такі экзамен на веданне дзяржаўных моў.

На думку **Алены ФІЛІМОНАВАЙ, начальніка галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі,** прамых перашкод у выкарыстанні і рускай, і беларускай моў у заканадаўчай сферы няма. «Але нешта ўсё роўна не дае тым суб'ектам, якія ўносяць законапраекты, ужываць беларускую мову больш часта», — кажа яна. Па словах Алены Філімонавай, з пункту гледжання літары закона ёсць магчымыя варыянты, як надалей развіваць выкарыстанне абедзвюх моў у прававой сферы: ці паспрыяць больш частаму ўжыванню беларускай мовы, ці пакінуць на тым узроўні, што ёсць зараз. «Перашкод няма — пытанне ў практыцы», — адзначае начальнік упраўлення мінюста.



**Мікалай САВАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення канстытуцыйнага і міжнароднага права, начальнік аддзела канстытуцыйнага права Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, кандыдат юрыдычных навук,** лічыць, што на дадзены момант праблема заключаецца ў тым, што пакуль няма юрыдычнай працэдуры, па якой будуць параўноўваць тэксты рускай і беларускай версій законапраектаў, і паўстае пытанне, хто гэтым будзе займацца.

Па яго словах, для распрацоўшчыкаў законапраектаў вельмі складана будзе працаваць з імі на дзвюх мовах адначасова, асабліва калі яны буйныя па памерах і пастаянна змяняюцца. Да таго ж дакумент трапляе не да аднаго чалавека, а да шырокага кола зацікаўленых.

«Лічу, што трэба прымаць законапраект на адной з моў і рабіць яго пераклад перад другім чытаннем, — прапанаваў ён. — І тады два варыянты законапраектаў прымаюцца Палатай прадстаўнікоў. Гэта адзіны варыянт. Калі паглядзець на замежны вопыт, то ў краінах шматмоўных самым эфектыўным з'яўляецца менавіта такі. Напрыклад, у Ірландыі».

Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі (НЦПІ) можа забяспечыць прыняцце нарматыўных прававых актаў на абедзвюх мовах, лічыць **Наталля СУДЗІЛОЎСКАЯ, начальнік упраўлення рэдакцыйна-выдавецкіх работ НЦПІ.** Але тут узнікае адразу некалькі пытанняў. Напрыклад, дата афіцыйнага апублікавання, якая залежыць ад таго, калі закон уступае ў сілу. Атрымліваецца, версіі на дзвюх мовах павінны паступіць адначасова і ў адзін момант быць апублікаванымі. Гэта пацягне павелічэнне аб'ёмаў афіцыйнага апублікавання і можа паўплываць на яго тэрміны. Таксама пытанні ўзнікнуць і з рэгістрацыйным нумарам. Ёсць праблема і забяспечанасці аўтэнтычнасці перакладу законапраектаў.

**Акадэмік Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ, першы намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,** выказаўся па моўным пытанні перш за ўсё як грамадзянін. «Сапраўды ўзнікла патрэба ва ўнясенні ўдакладненняў у закон аб мовах», — лічыць ён. Зараз закон дапускае выкарыстанне ў заканадаўстве ці асобна кожнай мовы, ці дзвюх адначасова. На яго думку, варта адыходзіць ад першага і набліжацца да другога варыянта.

На думку мовазнаўца, кожны грамадзянін мае права карыстацца любой з дзвюх дзяржаўных моў і, адпаведна, атрымліваць інфармацыю на кожнай з ёй. У тым ліку і прававую. І дзяржава павінна забяспечыць яму такое права. Таму ўсе заканадаўчыя акты агульнадзяржаўнага значэння павінны быць даступныя і на рускай, і на беларускай мовах.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

# ЯК НЕ «ЗГАРЭЦЬ» НА РАБОЦЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— І як знайсці сваё прызванне?***

— Трэба спрабаваць. А ці шмат людзей да 20-гадовага ўзросту маюць вопыт работы? Калі б малады чалавек папрактыкаваўся ў розных сферах, ён тады з большай доляй імавернасці змог бы сказаць, што яму падыходзіць.

Зрабіць выбар складана яшчэ і таму, што мы жывём у час, калі рынак працы хутка змяняецца і ўсачыць за усім складана. З'яўляецца шмат прафесій, якіх 10—15 гадоў таму яшчэ не было. Многія спецыяльнасці знікнуць. Тая ж прафесія бухгалтара — падлічыць можа і праграма. Ці перакладчыка — думаю, праз нейкі час штучны інтэлект навучыцца якасна перакладаць анлайн усё, што нам кажа іншы чалавек.

***— Як тады быць тым, хто цяпер працуе бухгалтарам, перакладчыкам?***

— Панікаваць дакладна не варта: невядома, за які перыяд часу гэтыя змены адбудуцца — напэўна, не так хутка. Але ў перспектыве давядзецца перакваліфікавацца. Мы прывыклі да стандартнага шляху: вучыцца чатыры-пяць гадоў ва ўніверсітэце і толькі потым шукаць работу. Але можна ж увайсці ў прафесію нашмат хутчэй. Засталіся лічаныя спецыяльнасці, дзе неабходна профільная вышэйшая адукацыя — урач напрыклад. У большасці выпадкаў дастаткова скончыць курсы. Узрост тут не перашкода. Ведаю, што ідуць перавучвацца — напрыклад, у IT — і ў 40 гадоў.

## Добры стымул — скарачэнне працоўнага дня

***— Работа павінна прыносіць задавальненне?***

— Праца ўзнікла як вымушаная неабходнасць. Але чалавек можа рабіць тое, што яму больш падабаецца. У нас шмат творчага патэнцыялу — творчасцю людзі з задавальненнем займаліся б. Эксперыменты з безумоўным даходам паказваюць, што апаскі наконт таго, што дай людзям грошы — ніхто не будзе працаваць, дарэмныя. Многія проста змянілі б сферу дзейнасці.

***— Работнікі інтэлектуальнай працы часта схільныя да эмацыянальнага выгарання. Чаму так здараецца, што прафесія, пра якую калісьці марыў, з гадамі становіцца нецікавай?***

— Эмацыянальнае выгаранне часцей за ўсё адбываецца, калі ўзнагарода не адпавядае патрачаным высілкам. Для людзей, якія заняты інтэлектуальнай працай, сістэма работы ад званка да званка, як на канвееры, дрэнна падыходзіць. Нездарма ж спробы ўвесці чатырохдзённы працоўны тыдзень маюць поспех. На мой погляд, недастаткова выкарыстоўваецца сістэма матывацыі. Усё ўпіраецца толькі ў грошы, але гэта вялікая памылка. Спробы плаціць усё больш не прыводзяць да жаданага эфекту. А вось скарачэнне працоўнага дня, плаваючы графік, дыстанцыйная работа, дадатковы свабодны дзень у тыдні могуць стымуляваць. Бо адна з прычын эмацыянальнага выгарання — тое, што людзі недастаткова адпачываюць.

***— Чаму грошы — не найлепшы стымул?***

— Яны маюць абмежаванне. У кожнага з нас ёсць свой узровень камфорту, і калі мы дасягаем яго, грошы перастаюць матываваць. Узяць нашу запаветную лічбу «па пяцьсот» — хутчэй за ўсё, многія на ёй спыніліся б, такога заробку было б дастаткова.

***— Навукоўцы раяць мяняць месца работы кожныя тры-пяць гадоў, каб пазбегнуць застою. Вы з гэтым згодны?***

— Так. Мала арганізацый думаюць пра ваша развіццё — гэта ваш клопат. Таму можа так скласціся, што, прапрацаваўшы пэўны час, вы дасягнулі пэўнага ўзроўню — і на гэтым усё, няма зрухаў. Але развіццё павінна быць — або вертыкальнае (угору па кар'ернай лесвіцы), або гарызантальнае (напрыклад, асваенне сумежнай спецыяльнасці). Клопат аб прафесійным росце супрацоўнікаў уласцівы японскім кампаніям. IT-галіна таксама пераймае гэта. Там ёсць рэсурсныя менеджары, чые задачы — выкарыстаць па максімуме патэнцыял работнікаў.

***— Быць працаголікам — гэта добра?***

— Тут ужо ў этымалогіі слова ёсць падказка. Працагалізм, як і любая залежнасць, — гэта дрэнна. Атрымліваецца, адзіная сфера жыцця, дзе чалавек спрабуе сябе рэалізаваць, — гэта прафесійная. Усе свае сілы ён аддае ёй. Гэтак жа, як алкаголік адчувае дыскамфорт, калі не ўжывае, так і працаголік не можа без работы. Але не думаю, што для нашых шырот падобная праблема актуальная. Для Японіі, Паўднёвай Карэі — так. У апошняй, каб змагацца з працаголікамі, у офісах па вечарах нават пачалі адключаць электрычнасць.

У беларусаў праблема, хутчэй, у няўменні пераключацца. Некаторыя людзі шмат часу праводзяць на працы, вельмі перажываюць з-за яе. Але немагчыма перарабіць усю работу — яна будзе заўсёды. Ёсць добрая дыягностыка, каб праверыць, ці не зацыклены вы на прафесійных абавязках: спытайце сябе, як вы правялі тыдзень. Ці ёсць аб чым расказаць? Многія гоняцца за шчасцем, быццам яго можна раз дасягнуць і зафіксаваць назаўсёды. Але гэта «пабочны эфект» ад таго, як вы арганізавалі сваё жыццё. Каб адчуваць сябе шчаслівым, трэба знаходзіць час не толькі на работу, але і на асабістыя адносіны (рамантычныя, сяброўскія), хобі, паўнавартасны адпачынак, фізічныя нагрузкі.

## Ідэальнага кіраўніка не існуе

***— Як папрасіць павышэнне, каб яго атрымаць?***

— А мяркуецца, што кожны, хто просіць, павінен яго атрымліваць? Аднаго жадання мала. Каб стаць начальнікам, не заўсёды дастаткова быць прафесіяналам. Патрэбны іншыя навыкі — кіравання, арганізацыі, камунікацыі. Чалавек можа быць добрым спецыялістам, але ён з людзьмі не ладзіць, як яго кіраўніком паставіць? Толькі за выслугу гадоў?

Лідарскія якасці можна развіць. А ў кагосьці гэтыя задаткі ёсць ад прыроды. Такія людзі часцей дабіваюцца павышэння, бо прывыклі быць лідарамі. Яны і ў школе праяўлялі актыўнасць, і ва ўніверсітэце.

***— На гутарках кандыдатаў часта пытаюць: «Кім вы бачыце сябе праз пяць гадоў?». А калі не ведаеш адказу?***

— Тады чалавек не вельмі разумее, куды яму рухацца. Я назіраю пастаянна прыкладна адну і тую ж карціну: маладыя людзі, скончыўшы ВНУ, перастаюць развівацца і навучацца. Вазьміце 27-гадовых і спытайце, якую кніжку па сваёй прафесіі яны прачыталі ў гэтым годзе. І я ўпэўнены, што многія не адкажуць. Важна самаадукоўвацца. Інтэрнэт існуе не толькі для коцікаў — там столькі інфармацыі, даступныя лекцыі і курсы найлепшых замежных універсітэтаў.

***— Пры якім кіраўніку камфортна працаваць?***

— Ні пры якім. Не бывае ідэальных кіраўнікоў. Гэта міф, заснаваны на ідэальным вобразе бацькоў. Усе мараць аб такім начальніку, як мама: ты робіш тое, што хочаш, а ён усё даруе. Мне прасцей дзяліць кіраўнікоў на адэкватных і не. Адэкватны — гэта здольны да дыялогу. А з тымі, хто не ўмее чуць, складана працаваць. Увогуле, хочаце ідэальнае начальства — самі станавіцеся прадпрымальнікам.

***— Лагічна. Але нямногія рашаюцца пачаць свой бізнес. Чаму?***

— Справа ў менталітэце. Гэта іншая філасофія. Прадпрымальнік — той чалавек, які цалкам бярэ адказнасць за сваё жыццё. Ён разумее, што ўвесь дабрабыт залежыць толькі ад яго. А наёмны супрацоўнік пагаджаецца з тым, што ён не гаспадар свайго лёсу, яму зручна перакласці частку адказнасці на плечы работадаўцы.

***— Што вылучае паспяховага чалавека?***

— Нам прасцей за ўсё вымяраць дасягненні ў грашах, але гэта няправільна. Тады паспяховымі людзьмі павінны лічыцца наркабароны, а не навукоўцы, якія патрацілі дзесяць гадоў, каб зрабіць важнае адкрыццё. Поспех вымяраецца грамадскім прызнаннем. Таму маладыя людзі так ахвочыя да лайкаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# МОЙ ДОМ — МАЯ КРЭПАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для вырашэння жыллёвага пытання пасля вайны ўзведзены Паўночны, Сельскагаспадарчы пасёлкі, забудовы ў раёне вуліц Багдановіча, Арлоўскай.

## ЗНОСІЦЬ НЕЛЬГА БУДАВАЦЬ

Дзе паставіць коску, горадабудаўнікі вырашалі доўга. Згодна з генпланам 2010 года большасць сядзібнай забудовы сталіцы ішла пад бульдозер. Прайшоў год — планы змяніліся. Новае рашэнне Мінгарвыканкама зацвердзіла праект, па якім захоўвалася 60 % дамоў. У 2017 годзе прадставілі новую «Схему рэканструкцыі тэрыторый сядзібнай забудовы г. Мінска». Згодна з ёй зносіць плануюць толькі трэць дамоў.

Умоўна сядзібныя ўчасткі Мінска можна падзяліць на некалькі груп. У першай — дамы, якім лёсам (прынамсі, да 2030 года) наканавана быць на карце сталіцы. Другая і трэцяя часткі — дамы пад знос да 2020 і пасля гэтага года. У чацвёртую групу ўключаны пабудовы, якія перашкаджаюць уладкаванню вулічна-дарожнай сеткі.

Пад ліквідацыю пападаюць дамы ў раёне вуліц Аэрадромнай, Жукоўскага, некаторыя сядзібныя ўчасткі Сельгаспасёлка, Лошыцы, Пятроўшчыны, Сухарава і Карзюкоў, забудовы абапал праспекта Дзяржынскага, вуліцы Ціміразева.

«Рашэнні аб зносе маюць горадабудаўнічыя, сацыяльна-эканамічныя перадумовы. Раней будаўніцтва развівалася, нарошчваліся тэмпы, але цяпер гэтыя планы перагледжаны. Аб'ёмы будаўніцтва скараціліся амаль на трэць у параўнанні з ранейшымі прагнозамі. У сувязі з гэтым і тэрытарыяльныя патрэбы для будаўніцтва сталі зніжацца, што выклікала змяненне планаў па выкарыстанні сядзібнай забудовы», — каментуе **галоўны архітэктар праектаў УП «Мінскграда» Зоя ЗАБАРОЎСКАЯ.**

Вызваленыя тэрыторыі плануюць выкарыстаць не толькі для ўзвядзення шматпавярховых дамоў, але і для будаўніцтва трэцяй лініі метро, асваення гарадскіх магістраляў.

«Уздоўж магістраляў мы павінны размясціць плошчы прыкладання працы, абслугоўвання аб'ектаў, жыллё, месцы для гандлю, адпачынку. Гэта тэрыторыі насычаныя, важныя, яны добра абслугоўваюцца. Калі ў іх укладваецца столькі сродкаў, трэба іх эфектыўна выкарыстоўваць. Такія тэрыторыі з метро, магістральнымі вуліцамі называюцца зонамі гарадскога планіровачнага каркаса», — тлумачыць галоўны архітэктар.

З-за разнастайных планаў рэканструкцыі гаспадарам не рэкамендавалі пераўладкаванне і перабудову жылля. «У канцы мінулага года выйшаў Указ № 463. Згодна з ім грамадзяне маюць права рэканструяваць жылыя дамы, якія ім належаць, з павелічэннем іх плошчы, а таксама ўзводзіць гаспадарчыя пабудовы на тэрыторыі каля дома нават у тых выпадках, калі горадабудаўнічай дакументацыяй намечаны знос сядзібнай забудовы», — цытуе дакумент Зоя Забароўская.

## А ШТО ЎЗАМЕН?

Правы ўладальнікаў дамоў абараняе Указ Прэзідэнта № 58. Згодна з ім жыхарам прызначаецца кампенсацыя за знесены дом.

Першы варыянт — ва ўласнасць прапануюць кватэру тыповых спажывецкіх якасцяў. Калі рынкавы кошт дадзенага жылля меншы за цану дома, які падлягае зносу, дадаткова выплачваецца грашовая кампенсацыя ў памерах розніцы. Агульная плошча новай кватэры павінна вызначацца з разліку не менш за 15 кв. м на чалавека, зарэгістраванага ў запланаваным пад знос доме.

Магчыма ўзяць кампенсацыю і грашыма. Яна будзе разлічвацца ў памеры рынкавага кошту, але не меншай за суму, неабходную для будаўніцтва раўнацэннага жылля. Выплацяць грошы не толькі за яго.

«Ацэньваюць не толькі нерухомасць, але і ўсё, што людзі ўклалі ў гэтую зямлю. Яны пасадзілі кусты, пладовыя дрэвы, зрабілі агароджу. Звычайна кажуць не чапаць дрэвы, яны будуць залічаны ў кошт», — адзначае Зоя Забароўская.

## КАЛІ ХАТА НЕ З КРАЮ

Партрэт прыватнага сектара Мінска досыць разнастайны. З цаглянымі двухпавярховымі палацамі суседнічаюць напалову разбураныя, з аблезлай фарбай, маленькія драўляныя хаткі. Парадокс — некаторыя гаспадары толькі і чакаюць зносу, а хтосьці асабліва балюча ставіцца да гэтага пытання, укладваючы ўласную працу і сродкі ва ўладкаванне жылля. А гэты клопат досыць дорага абыходзіцца. Свой дом — раскоша не для лянівых.

— Жыву ў прыватным доме ўжо больш за 30 гадоў. Памяняць яго на кватэру не згадзілася б. З пачаткам вясны клопатаў прыбаўляецца. Трэба высадзіць кветкі, прыбраць тэрыторыю, падфарбаваць плот. Маю свой невялікі агарод. Высаджваю агуркі, памідоры, салату. Такая ж гаспадарка ёсць і ў многіх суседзяў, — дзеліцца жыхарка Паўночнага пасёлка Наталля.

Яе падтрымлівае суседка Жанна: «Усе выгоды нам прыходзілася будаваць самастойна: ваду, каналізацыю, усталёўваць кацёл, бойлер. Жыць у прыватным доме складана — трэба яго самастойна рамантаваць, рабіць тратуарныя дарожкі, касіць траву, восенню падмятаць лісце, зімою — чысціць снег. Цэлы год сам працуеш, не чакаючы дапамогі ад камунальных службаў».

Клопат аб парадку на сядзібных участках — таксама задача спецыялістаў раённых ЖРЭА. Рэгулярна яны робяць абходы, выдаюць загады на ліквідацыю парушэнняў, сочаць за іх выкананнем.

На тэрыторыі каля сядзібнага дома ў сталіцы не дазваляецца разводзіць жывёл. Па ўласным жаданні гаспадар можа распрацаваць зямлю для пасадкі цыбулі ці салаты, але гэта ўжо пытанне экалагічнасці будучай агародніны.

## ПАЛІТЫКА ДОМАЎЛАДАННЯ

Горад — сапраўдны жывы арганізм, які пастаянна развіваецца, прырастае новымі тэрыторыямі, жыхарамі. Яго жыццядзейнасць рэгулюецца генеральным планам, які мае паэтапную, ступеньчатую структуру праектавання. Ён досыць шырокі. Уключае пытанні транспарту, жылля, развіцця вытворчасці, інфраструктуры, ландшафту, экалогіі, эканомікі, абслугоўвання.

Пэўныя дакументы і праграмы адносна сядзібнай забудовы выпрацаваць складана. Работа з прыватным сектарам складаецца з дзейнасці многіх ведамстваў і службаў. Яны, у сваю чаргу, патрабуюць нарматываў у розных сферах — будаўніцтве, санітарыі, экалогіі, супрацьпажарнай бяспецы.

Асаблівасць сядзібнай забудовы сталіцы ў тым, што яна ўжо сфарміравалася. Сёння задача для горадабудаўнікоў і домаўладальнікаў — эфектыўна яе выкарыстоўваць, ствараючы неабходную інфраструктуру.

«Напрыклад, мала ў якіх раёнах сядзібных забудоў вытрымліваецца нарматыўная адлегласць да дзіцячага садка. Таму трэба вырашаць пытанні абслугоўвання прыватных дамоў: даступнасці гандлёвых аб'ектаў, транспарту», — тлумачыць Зоя Забароўская.

Трэба працаваць над стварэннем нормаў і правілаў для арганізацыі жыццядзейнасці ў сядзібных забудовах сталіцы ў плане ўтрымання дамоў, агароджвання, чысціні.

За аблічча іншых гарадоў краіны адказвае Беларускі дзяржаўны навукова-даследчы і праектны інстытут горадабудаўніцтва. Па словах галоўнага архітэктара, рашэнні гэтай установы адносна сядзібнай забудовы ў абласцях у асноўных прынцыпах суадносяцца з напрамкамі дзейнасці УП «Мінскграда». А менавіта: знос у цэнтральнай частцы горада, фарміраванне магістраляў.

«Чым ніжэйшы ўзровень значнасці горада, тым большы там працэнт сядзібнай забудовы дазволены», — дадае Зоя Забароўская.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЯК У СУСЕДЗЯЎ?

Трэнд многіх еўрапейскіх гарадоў — блакіраванае жыллё. Такі дом складаецца з некалькіх кватэр і дапаможных памяшканняў. Дамы маюць агульную сцяну, але ў кожнага — асобны ўваход і невялікі ўчастак зямлі. Але такія праекты беларусам не вельмі прыйшліся даспадобы.

«Блакіраваныя забудовы ёсць у Вялікай Сляпянцы, побач з вёскай Мядзведжына. Мы гаворым, што гэты тып забудовы больш тэрытарыяльна эканамічны, кампактны. Можна выкарыстаць розныя прыёмы блакіроўкі, размясціць па дзве, тры кватэры. Забудова можа ісці са змяшчэннем, блакіроўкай гаражоў. Але такое суседства не вельмі прывабнае для нашых грамадзян. Увогуле, у еўрапейскіх гарадах архітэктура больш падпарадкавана рацыянальнасці і функцыянальнасці», — адзначае Зоя Забароўская.

Па словах архітэктара, горад павінен мець разнастайнае аблічча. Адмаўляцца поўнасцю ад сядзібнай забудовы нельга. Калі прыватным сектарам правільна карыстацца і падтрымліваць у дастойным выглядзе, ён можа стаць упрыгажэннем сталіцы.

«Сядзібны дом — гэта камфорт для жыцця, асаблівы дух. А якія ў нас незвычайна цёплыя адносіны з суседзямі! Не чуем крыкаў чужых дзяцей за сцяной, а лесвічную пляцоўку ніхто не застаўляе веласіпедамі. Якая асалода летам частаваць сяброў агуркамі, што выраслі на сваім участку, а ўвосень, збіраючыся на работу, сарваць яблык з дрэва, якое расце за варотамі!» — расказвае Наталля з Паўночнага пасёлка.

Пачуўшы гэта, крыху зайздросціш і разумееш, чаму гаспадары не згаджаюцца мяняць такі лад жыцця на «шматпавярховыя» квадратныя метры.

**Марыя ДАДАЛКА.**

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 4 (79)



## Плюс восем пазіцый

**41-е месца заняла Беларусь сярод самых магутных армій свету**

Нядаўна аналітычная кампанія Global Firepower склала рэйтынг наймацнейшых армій на планеце. Узброеныя Сілы Беларусі размясціліся ў ім на 41-м месцы. Цікава, што за год прырост склаў ажно восем пазіцый.

Суседзі Беларусі па рэйтынгу — Румынія і Перу (40-е і 42-е месцы адпаведна). Топ-3 складаюць ЗША, Расія і Кітай. Рэйтынг фарміруецца, грунтуючыся на 55 паказчыках. Усяго ў ім удзельнічаюць 136 дзяржаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## КІТАЙСКІ ВЕКТАР

Беларусь і Кітай маюць трывалы вопыт супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай сферы. Ён датычыцца шматлікіх яе галін. Напрыклад, больш за 270 ваеннаслужачых з Паднябеснай ужо атрымалі дыпломы Ваеннай акадэміі Беларусі, а ў Кітаі 77 нашых вайскоўцаў прайшлі бясплатнае навучанне. Двухбаковыя сувязі прадугледжваюць стасункі і ў галіне сучаснага ўзбраення і ваеннай тэхнікі.

Менавіта таму Беларусь стала адной з краін, якую наведаў член Дзяржаўнага савета Кітайскай Народнай Рэспублікі, міністр абароны КНР генерал-палкоўнік Вэй Фэнхэ падчас свайго першага афіцыйнага візіту на гэтай пасадзе. Ён сустрэўся з міністрам абароны Беларусі генерал-лейтэнантам Андрэем Раўковым.

За 26 гадоў з часу ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі дасягнуты значныя поспехі. Беларусь і Кітай здолелі выбудаваць адносіны давернага, ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, — зазначыў Андрэй Раўкоў.

Вайсковае ж супрацоўніцтва адбываецца дзякуючы адпаведнай дамове, якая была падпісана амаль восем гадоў таму. За апошнія шэсць гадоў КНР наведала восем, а Беларусь — 13 ваенных дэлегацый высокага ўзроўню. Таксама праводзяцца сумесныя трэніроўкі падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і паветрана-дэсантных войскаў Кітая. А летась у кастрычніку было падпісана пагадненне, згодна з якім Кітай акажа нашай краіне бязвыплатную ваенную дапамогу на суму 4,5 мільёна долараў. Працуе і адмысловы беларуска-кітайскі камітэт па стасунках у галіне ўзбраення і ваеннай тэхнікі.

Сярод праектаў, якія рэалізуюцца зараз, — распрацоўка тапаграфічнага стэрэаскапічнага комплексу высокай дакладнасці. Ён можа ўжывацца ў касмічных апаратах. Таксама праектуецца праграмны комплекс электроннай абароны для сістэм падтрымкі прыняцця рашэння.

Але самы вядомы вынік супрацоўніцтва дзвюх краін — рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз-М», якая мае далёкасць да 300 кіламетраў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Танкі на «Лініі Сталіна»

**«Танкавы біятлон — 2018» сёння пройдзе ў гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна». Спаборніцкае шоу адбудзецца пры падтрымцы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Гэтым разам плануецца пашырыць фармат спаборніцтваў. Таксама наведвальнікам будзе прапанавана больш забаў і конкурсаў.**



Фота Міністэрства абароны.

Мерапрыемства пачынаецца а 11-й гадзіне адкрыццём экскурсійных і інтэрактыўнах зон для наведвальнікаў, а таксама запрацуе выстава тэхнікі і ўзбраення. Будуць працаваць папулярныя зоны забаў гісторыка-культурнага комплексу «Школа артылерыста», спаборніцкая пляцоўка. Госці змогуць паўдзельнічаць у гістарычнай віктарыне. Танкавы біятлон пачнецца ў 14.20. Дзецям да шасці гадоў уключна білет не патрэбны. Дзіцячы білет магчыма набыць да 18 гадоў.

Упершыню танкавы біятлон на «Лініі Сталіна» прайшоў у кастрычніку 2016 года. Тады паглядзець на змаганні чатырох камандаў беларускай арміі прыйшло некалькі тысяч гледачоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Падзея

# ПРАЙШЛІ ПРАЗ САЛДАЦКІЯ БУДНІ

**Урачыстыя провады ваеннаабавязаных, прызваных з запасу для ўдзелу ў навучальным праверачным зборы, адбыліся ў 72-м аб'яднаным навучальным цэнтры ў Печах. Амаль месяц у вучэннях прымалі ўдзел каля дзвюх тысяч жыхароў Мінска і Мінскай вобласці. Сярод іх былі прадстаўнікі самых розных узроставых катэгорый — ад 25 да 50 гадоў. Упершыню за чвэрць стагоддзя на вучэнні было прызвана каля 50 жанчын, якія выконвалі задачы, звязаныя з медыцынскай дапамогай, сфарміравалі асобны медыцынскі атрад.**



Міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ узнагароджвае аднаго з удзельнікаў навучальнага праверачнага збору.

Фота Міністэрства абароны.

### ДА ВЫКАНАННЯ ЗАДАЧ ГАТОВЫЯ

Падчас цырымоніі **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ** падвёў вынікі вучобы і ўзнагародзіў тых, хто вызначыўся. Праверка праводзілася раптоўна, таму ў большасці прызыўнікоў былі лічаныя гадзіны для таго, каб прыйсці ў ваенкамат і адправіцца да месца правядзення збораў для камплектавання 37-й асобнай механізаванай брыгады.

На працягу месяца асабовы склад 37-й брыгады займаўся адзіночнай падрыхтоўкай, удзельнічаў у камандна-штабным, а затым тактычным вучэннях з механізаваным батальёнам. У ходзе вучэнняў было задзейнічана больш за 400 адзінак тэхнікі.

### ВУЧЭННІ Ў АСОБАХ

**Капітану запасу, начальніку фінансавай службы асобнага батальёна матэрыяльнага забеспячэння Андрэю ШАЎЦОВУ** ў дзень звальнення ў запас споўнілася 50 гадоў. Акрамя таго, падчас удзелу ў вучэбна-праверачным зборы яму прысвоілі званне капітана. Як ён прызнаўся, за месяц яму прыйшлося добра папацець — умовы вучэнняў былі максімальна набліжаны да баявых.

«Чалавек хутка прывыкае да салдацкіх умоў. Таксама вельмі дапамагала тое, што мы стараліся падтрымліваць адзін аднаго падчас вучэнняў. Калі маркаваць па маіх курсанцкіх гадах, а я былы кадравы ваенны, служба была вельмі падобнай. Два тыдні мы жылі ў казарме, аднаўлялі веды, а далей — практыка», — расказаў Андрэй Шаўцоў. Убачыць свайго сына пасля месячнай службы ў Печы прыехалі яго бацькі. Кажуць, што, вядома, сумавалі, але яшчэ і хацелася ўбачыць сына ў форме. На іх думку, праводзіць такія зборы сёння важна, бо яны дапамагаюць успомніць навыкі, якія неабходны для абароны сваёй краіны.



Святлана і Максім КАДЗЕБЫ.

На вучэбна-праверачныя зборы ішлі нават цэлымі сем'ямі. **Максім КАДЗЕБА** летась вярнуўся са службы, якую праходзіў у пагранічных войсках у Брэсце. Калі даведаўся, што яго жонцы прыйшла павестка на вучэнні, вырашыў пайсці з ёй добраахвотнікам. Перажываў за яе, бо яна ўпершыню трапіла ў войска. Ён быў у роце сувязі, а яна — у асобным медыцынскім атрадзе. Праўда, бачыліся нячаста. **Святлана КАДЗЕБА** расказала, што цяпер у яе з'явілася разуменне, што такое салдацкія будні. «Было няпроста. За гэты час у асобным медыцынскім атрадзе мы жылі па салдацкай дысцыпліне і распарадку дня. Палепшылі свае веды ў аказанні медыцынскай дапамогі», — расказала Святлана Кадзеба.

А **падпалкоўнік запасу Андрэй БЯЛОЎ** змог пабачыцца са сваім сынам Ільём, які зараз праходзіць службу ў 5-й асобнай брыгадзе спецыяльнага прызначэння і пераехаў у Печы вучыцца на камандзіра камандна-штабной машыны. Андрэй Бялоў з 1986 года надзеў пагоны сувораўца, пасля гэтага паступіў у Разанскае паветрана-дэсантнае вучылішча і з тых часоў служыў у паветрана-дэсантных войсках і сілах спецыяльных аперацый. Два гады таму пайшоў на пенсію і вось зараз зноў быў у страі. На яго думку, зборы прайшлі выключна добра. Яго сын падчас вучэнняў забяспечваў пражыванне, рыхтаваў казармы. «Мы змаглі паслужыць разам. Пасля таго як яны з'ехалі ў поле, па артыкулах у газетах я зразумеў, што месяц у іх быў «гарачы», — дадаў **Ілья БЯЛОЎ.**

Андрэй Бялоў пацвердзіў, што дзякуючы інтэнсіўнай працы веды і ўменні ў галаве аднавіліся маментальна. «На зборах адпрацоўваюцца канкрэтныя мерапрыемствы: мабілізацыя, падрыхтоўка, практычныя дзеянні. Мы ўвесь час былі занятыя», — заўважыў ён.

Як вынік, па заканчэнні збору, на ўрачыстым мерапрыемстве ў Печах, міністр абароны Андрэй Раўкоў адзначыў, што сістэма камплектавання і навучання спрацавала выдатна. Ён падзякаваў усім удзельнікам збораў за поўную аддачу ў выкананні пастаўленых задач.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## Афіцэраў запасу прызавуць на службу

**Каля 100 афіцэраў запасу прызавуць сёлета на службу ва Узброеныя Сілы краіны. Савет Міністраў да 1 лютага 2019 года павінен прадставіць Прэзідэнту інфармацыю аб выніках прызыву.**

Сёлета на ваенную службу ва Узброеныя Сілы будуць прызываць мужчын ва ўзросце да 27 гадоў з ліку афіцэраў запасу, якія не прайшлі тэрміновую ваенную службу. Міністэрству абароны, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 134 «Аб прызыве афіцэраў запасу на ваенную службу», даручана забяспечыць прызначэнне прызваных грамадзян на вайсковыя пасады, якія адпавядаюць іх ваенна-ўліковым спецыяльнасцям.

# Брыгада прызнана баяздольнай

**Праверка Узброеных Сіл праводзілася Дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Адпаведнае распараджэнне на выкананне практычных мерапрыемстваў было ўручана міністру абароны генерал-лейтэнанту Андрэю Раўкову 12 сакавіка.**

Праверка мела комплексны характар, ставілася мэта ахапіць найбольш важныя пытанні баявой гатоўнасці і паўсядзённай дзейнасці беларускай арміі. Праз яе прайшлі падраздзяленні разнастайных родаў і віда войскаў. Гэта разведка, ракетныя войскі і артылерыя, механізаваныя, зенітныя ракетныя войскі і авіяцыя. Сярод іншага, праводзіліся вучэнні з баявой стральбой. З арсеналаў, баз і складоў Міністэрства абароны пастаўлялася ўзбраенне, вайсковая і спецыяльная тэхніка.

Вельмі значная ўвага ўдзялялася сістэме адмабілізавання войскаў, у тым ліку гатоўнасць сфарміраваць асобную механізаваную брыгаду і яе здольнасць выконваць прызначаныя задачы. З першых жа дзён пачалося правядзенне кантролю за станам тэхнікі і ўзбраення. Для больш дбайнай праверкі былі прыцягнуты спецыялісты прадпрыемстваў Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. Пад кантроль патрапілі складанае радыёэлектроннае абсталяванне, сістэмы, вузлы і агрэгаты ўзбраення. У Міністэрстве абароны паведамілі, што ў цэлым каля 10 % тэхнікі, якая захоўваецца ў арсеналах і базах, прайшло праз тэсціраванне. Узоры ўзбраення былі прызнаны спецыялістамі тэхнічна спраўнымі і гатовымі выконваць задачы па прызначэнні.

Асаблівую ўвагу ўдзялялі ацэнцы магчымасцяў сіл і сродкаў ВПС і войскаў ППА па прыкрыцці адміністрацыйна-прамысловых раёнаў і прадухіленні актаў паветранага тэрарызму. Дзяжурныя сілы па проціпаветранай абароне былі правераныя палётамі кантрольных цэляў, ацэнены дзеянні органаў кіравання па паветраных парушальніках дзяржаўных граніц, судах-парушальніках парадку выкарыстання паветранай прасторы. У якасці кантрольных цэляў да праверкі прыцягваліся лятальныя апараты, яны дзейнічалі на розных вышынях — ад сярэдніх да гранічна малых. Да праверкі прыцягваліся разлікі зенітных ракетных і радыётэхнічных войскаў, а таксама экіпажы паветраных суднаў авіяцыйных часцей ВПС і войскаў ППА. Яны здзейснілі маршы ў прызначаныя раёны і ва ўстаноўленыя тэрміны заступілі на баявое дзяжурства. Радыёлакацыйнае поле было ўзмоцнена дзеяннямі рухомых малавышынных радыёлакацыйных груп радыётэхнічных войскаў. Авіяцыя выконвала задачы па размеркаванні часткі сіл і сродкаў.

А што адбывалася ў наземных войсках? Механізаваны батальён са складу 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады адпрацаваў задачы па блакаванні і знішчэнні калоны бранятэхнікі ўмоўнага праціўніка ў раёне Ваўкавыска, прайшоўшы перад тым 20-кіламетровы марш. Проціпаветранае і знішчальна-авіяцыйнае прыкрыццё дзеянняў войскаў ажыццяўлялі баявыя разлікі зенітных ракетных падраздзяленняў і экіпажы авіяцыі. У неба падняліся вучэбна-баявыя самалёты Як-130, знішчальнікі МіГ-29, верталёты Мі-8МТВ-5 і Мі-24.

Прайшло і тактычнае вучэнне з авіяцыяй і зенітнымі ракетнымі войскамі. Яго фіналам стала практычнае бомбакіданне і баявыя пускі зенітных кіруемых ракет на палігонах Ружаны і Даманава. На апошнім з іх войскі ВПС і ППА адпрацавалі вядзенне проціпаветранага бою.

У Барысаўскім гарнізоне пасля праверкі інспектарамі ваеннай аўтамабільнай інспекцыі спраўнасці тэхнічных сродкаў калоны, аўтамабільнай і гусенічнай тэхнікі, 31 сакавіка падраздзяленні злучэння здзейснілі марш у прызначаны раён на 227-ы агульнавайсковы палігон «Барысаўскі». У маршы ўдзельнічала больш за 300 адзінак узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі. Карэспандэнты «Звязды» асвятлялі тады падрыхтоўку да маршу. Падчас пераходу вадзіцелі атрымалі практыку кіравання ў складаных умовах надвор'я. А пасля прыбыцця на палігон ваеннаабавязаныя адпрацоўвалі шмат пытанняў. Сярод іх — арганізацыя аховы, інжынернага і тылавога забеспячэння, тэхнічнае абслугоўванне ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, выверка прыцэльных прыстасаванняў і прыстрэлка ўзбраення баявых машын. Камандна-штабное вучэнне з брыгадай пад кіраўніцтвам камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання пачалося 7 красавіка.

А 13 красавіка прызваныя з запасу ваеннаабавязаныя, якія праходзілі зборы ў 37-й гвардзейскай асобнай брыгадзе, адправіліся дадому.

— Падчас комплекснай праверкі Узброеных Сіл была праверана сістэма адмабілізавання, — зазначыў міністр абароны Андрэй Раўкоў. — У рамках гэтага была сфарміравана 37-я гвардзейская асобная механізаваная брыгада. Вы ў вельмі кароткія тэрміны аднавілі навыкі і веды, якія атрымалі ў розных структурах. І менавіта таму годна выканалі пастаўленую перад вамі задачу. Брыгада была прызнана баяздольнай.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Памяць

# ГВАРДЫЯ НЕ ЗДАЕЦЦА!

**10 мая спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Джумаша Асаналіева, які праславіўся ў баях за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

За некалькі кіламетраў ад пасёлка Ула Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці на высокім беразе Заходняй Дзвіны каля вёскі Узрэчча ўзведзены мемарыяльны комплекс. Тут каля падножжа брацкай магілы ўзвышаецца велічная, амаль шасціметровая фігура воіна са схіленай галавой і ўстаноўлена 13 пліт з імёнамі 210 пахаваных байцоў розных воінскіх званняў, нацыянальнасцяў і ўзростаў. У ліку тых, хто знайшоў свой апошні прытулак на віцебскай зямлі, — восем Герояў Савецкага Саюза, удастоеных гэтага высокага звання пасмяротна за фарсіраванне ракі, захоп, утрыманне і пашырэнне плацдарма на левым беразе Заходняй Дзвіны. Тут жа, у брацкай магіле, спачывае прах Героя Савецкага Саюза гвардыі яфрэйтара Джумаша Асаналіева. Надпіс на мемарыяльнай дошцы помніка гаворыць: «У гэтым раёне 24 чэрвеня 1944 года воіны 6-й гвардзейскай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту фарсіравалі Заходнюю Дзвіну, захапіўшы плацдарм на левым беразе». У нашы дні каля гэтага памятнага месца заўсёды спакойна: мясцовым жыхарам і замежным турыстам адкрываецца прыгожая і шырокая панарама рачной воднай роўнядзі, змешанага лесу, невялікага населенага пункта на супрацьлеглым беразе. А 74 гады таму навакольная абстаноўка была зусім іншай: тут на берагах ракі зямля скаланалася ад бесперапынных выбухаў, аглушальна грымелі разрывы снарадаў і мін, а кулямётна-аўтаматныя чэргі, якія бесперапынна рэзалі паветра, і стрэлы вінтовак заглушалі дакладныя каманды камандзіраў па фарсіраванні асабовым складам паўнаводнай і імклівай Заходняй Дзвіны.



Летам 1944 года, удзельнічаючы ў Віцебска-Аршанскай наступальнай аперацыі, 6-я гвардзейская армія 1-га Прыбалтыйскага фронту павінна была прарваць абарону саперніка на фронце 18 км у агульным напрамку на Чашнікі, Лепель, Бешанковічы і забяспечыць увод у прарыў 1-га танкавага корпуса ў напрамку на Бешанковічы. З гэтай мэтай Ваенны савет арміі аддаў падначаленым злучэнням і часцям баявое распараджэнне: імкліва праследуючы праціўніка, з ходу фарсіраваць Заходнюю Дзвіну. Гітлераўскае камандаванне разумела, што страта рубяжа на Заходняй Дзвіне пагражае сур'ёзнымі наступствамі, таму праціўнік біўся за кожны метр, не шкадуючы сіл і сродкаў, каб утрымаць яго. Фашысты кідалі ў бой усе наяўныя рэзервы, толькі б стрымаць наступленне савецкіх войскаў і паспець абсталяваць рубяжы на Заходняй Дзвіне.

Першай на варожы бераг высадзілася група смельчакоў на чале з афіцэрамі Вярбіцкім, Катлярам і Аляксандравым. Адважныя кулямётчыкі на самаробных плытах удачна пераправілі свае станковыя кулямёты і пад агнём праціўніка ўплаў пераправіліся цераз Заходнюю Дзвіну. Кулямётчыкі дапамаглі байцам адбіць контратаку фашыстаў і прыкрыць агнём пераправу галоўных сіл батальёна.

Сярод першых чырвонаармейцаў, якія пераправіліся каля вёскі Лабейкі Бешанковіцкага раёна на бераг, заняты фашыстамі, быў і кулямётчык 199-га гвардзейскага стралковага палка 67-й гвардзейскай стралковай дывізіі гвардыі яфрэйтар Джумаш Асаналіеў. У фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца копія ўзнагароднага ліста адважнага сына кіргізскага народа, падрыхтаванага камандзірам палка гвардыі падпалкоўнікам Дзегцяровым. Вось яго змест: «У наступальным баі па фарсіраванні Заходняй Дзвіны ў раёне населенага пункта Лабейкі 24 чэрвеня 1944 года яфрэйтар Асаналіеў, замяніўшы выбыўшага са строю старшага сяржанта Макеева, першы пераправіў свой кулямёт на варожы бераг. Заняўшы агнявую пазіцыю на правым флангу батальёна, на самым адказным участку абароны, стойка адбіваў са сваім разлікам атакі праціўніка. Выбухам міны выводзіцца са строю ўвесь разлік станковага кулямёта, таварыш Асаналіў застаецца адзін са станковым кулямётам, малой колькасцю патронаў і некалькімі гранатамі. І вось Асаналіеў прымае няроўны бой з праціўнікам. Падпусціўшы на блізкую адлегласць контратакуючых немцаў, Асаналіеў агнём з кулямёта расстрэльвае іх ва ўпор. Гітлераўцы, кінуўшы на полі бою да 20 забітых, адступаюць. Але на зыходзе боепрыпасы. Убачыўшы гэта, гітлераўцы імкнуцца жывым узяць героя-кулямётчыка, Асаналіеў гранатамі знішчае яшчэ некалькі фрыцаў, але кола вакол героя ўсё звужаецца і сціскаецца. «Рус, здавайся!» — зараўлі немцы, але адважны воін-кіргіз, узяўшы ў рукі апошнюю гранату, вырывае з яе кальцо і са словамі «Гвардыя не здаецца!» узрывае сябе разам з некалькімі гітлераўцамі». Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 ліпеня 1944 года за мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, гвардыі яфрэйтару Джумашу Асаналіеву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

... Джумаш нарадзіўся 10 мая 1923 года ў сяле Атуз-Уул Ак-Суйскага раёна Ісык-Кульскай вобласці Кыргызстана ў сялянскай сям'і. З'яўленне доўгачаканага першынца для ўжо немаладых бацькоў стала сапраўдным шчасцем, падарункам лёсу. Джумаш з малых гадоў палюбіў прыроду, горы, з задавальненнем хадзіў з бацькам Асаналы на паляванне, хутка навучыўся трапна страляць, не здагадваючыся, што гэтыя снайперскія навыкі яму вельмі спатрэбяцца ўжо ў недалёкай будучыні...

Пасля заканчэння сярэдняй школы юнак працаваў у калгасе чабаном. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён, настойліва ўпрошваючы ваенкама, дабіваўся таго, каб дабравольцам пайсці на фронт, але з прычыны непрызыўнога ўзросту яму ў гэтай просьбе адмовілі. Нарэшце ў 1942 годзе Пржэвальскім раённым ваенным камісарыятам Джумаш быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Праводзячы яго ў войска, бацька даў наказ: «Бі без літасці фашыстаў, сын, не шкадуй гэтых ворагаў. Ніколі не забывай, колькі людзей загінула ад іх рук. Веру, калі прыйдзецца застацца на полі бою аднаму, будзеш змагацца да канца, не здасіся і не зняславіш наш паважаны род». Не мог забыць Джумаш і кранальнага развітання з маці, якая праводзіла яго ад роднага сяла да райцэнтра. «Я вярнуся, мама! — абяцаў адзіны сын у сям'і. — Абавязкова вярнуся з перамогай!»

У запасным палку, куды прыбыў Джумаш, маладое папаўненне настойліва і паскораным тэрмінам навучалася азам ваеннай навукі. Вясковая загартоўка, прыродны спрыт, кемлівасць, вынослівасць, навыкі трапнага паляўнічага дапамаглі Джумашу паспяхова асвоіць курс маладога байца: ён стаў кулямётчыкам, атрымаў званне яфрэйтара. Ліпеньскай раніцай 1943 года ў гарачай бітве пад Курскам кулямётчык Асаналіеў прыняў баявое хрышчэнне. У першым баі быў паранены, на шчасце, асколачнае раненне аказалася лёгкім. Падлячыўшыся ў палявым шпіталі, салдат зноў вярнуўся ў родную часць, у якой у складзе 6-й гвардзейскай арміі ўдзельнічаў у вызваленні Белграда і Харкава, разгроме невельскай групоўкі праціўніка, а з лета 1944 года — у Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён».



У Беларусі памятаюць адважнага кыргызстанца і свята шануюць яго памяць. У 1976 годзе ў Мінску адну з новых вуліц (з завулкам) назвалі яго імем, а на доме ўсталявалі мемарыяльную дошку. 1 ліпеня 2005 года ў Мінску на скрыжаванні вуліц Асаналіева і Асіповіцкай быў адкрыты помнік герою, усталяваны па ініцыятыве пасольства Кыргызстана ў Рэспубліцы Беларусь і адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы. У салдацкай пілотцы застыў у бронзе воін-вызваліцель, былы чабан, якому споўніўся ў 1944-м усяго 21 год. Імя слаўнага сына Кыргызстана залатымі літарамі выбіта ў Зале Перамогі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У сяле Атуз-Уул Ак-Суйскага раёна каля будынка сярэдняй школы ўсталяваны бюст Джумаша, імя яго носіць школа і адна з вуліц гэтага сяла. У школьным музеі вялікая частка экспазіцыі таксама прысвечана былому вучню-герою.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА**




# Мы разам — Беларусь!





## Краіна моцная рэгіёнамі: Уздзенскі раён

Сяргей САВІЦКІ:

# «Знаёмства з раёнам пачаў не з моцных суб'ектаў гаспадарання, каб не заспакойвацца»

**Старшыня райвыканкама пра кадры, турыстычны патэнцыял раёна і жыццё на новым месцы**

**Крыху больш як чатыры месяцы таму Сяргей Савіцкі прызначаны старшынёй Уздзенскага раённага выканаўчага камітэта. Да гэтага працаваў першым намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Дзяржынскага райвыканкама.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Сяргей Канстанцінавіч, адна справа быць намеснікам, і зусім іншая — адказваць за цэлы раён. Магчыма сустрэліся напачатку з нейкімі цяжкасцямі. І наогул, з чаго пачалі сваю дзейнасць?***

— Асаблівых цяжкасцяў не было. Гэтаму паспрыялі тыя абставіны, што крыху больш як год я адпрацаваў у Дзяржынскім раёне. Мікалай Іванавіч Арцюшкевіч — мудры кіраўнік, які навучыў мяне мысліць па новаму, больш шырока, не зацыклівацца на адных пытаннях.

Пасля таго, як заступіў на новую пасаду, пачаў знаёміцца з раёнам, прычым не з тымі прадпрыемствамі, арганізацыямі, дзе справы ладзяцца. У першую чаргу наведаў слабыя, каб сябе не заспакойваць. Вывучыў стан спраў не толькі на вытворчасці, але і ў сацыяльнай, культурнай сферы, сферы аховы здароўя.

***— І якія першыя ўражанні? Магчыма, нешта трэба папраўляць?***

— Калі ўзяць сацыяльную сферу, то яна ў раёне моцная. У прыватнасці, сельскія школы практычна не адрозніваюцца ад гарадскіх. Усе будынкі ў нармальным стане, адпавядаюць стандартам. Банк рэканструкцыі і развіцця выдзяляе грошы на рамонт уваходнай групы, падлогі і самае галоўнае — харчавальнага блока ў Уздзенскай сярэдняй школе № 1 імя. А. С. Пушкіна.

Рамонт чакаецца і ў Уздзенскай гімназіі. Давядзецца навучальны працэс у гэтых установах арганізаваць у дзве змены.

Няма праблем і ў культуры. А гарадскому Палацу культуры можа пазайздросціць любы райцэнтр. Гэты прасторны будынак у выглядзе дыямента нагадвае Нацыянальную бібліятэку. У планах — рамонт дахаў некаторых сельскіх дамоў культуры і Дзешчанскага цэнтра вольнага часу. У Каралёве да святкавання раённых Дажынак у 2018-м таксама плануецца рамонт Дома культуры.

Што датычыцца сістэмы аховы здароўя, то галоўны ўрач цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандр Дрэйчук шмат зрабіў у плане рамонту, які вёў гаспадарчым спосабам, што дало магчымасць сэканоміць на кошце работ. Аляксандр Аляксандравіч — моцны адміністратар, які прывёў у ідэальны стан харчавальны блок, пральню, фасады будынкаў цэнтральнай раённай бальніцы. Засталося крыху папрацаваць над эстэтычным аздабленнем. У сельскай мясцовасці непазнавальна змяніліся фельчарска-акушэрскія пункты як звонку, так і знутры. У вёсцы Цялякава працуе бальніца сястрынскага догляду на базе былой школы, разлічаная на 25 месцаў. Але гэтага недастаткова. Варта было б павялічыць напаўняльнасць да 50 месцаў. Магчымасці ёсць — другі паверх будынка пакуль пустуе.

Лабараторыя ў бальніцы аснашчана сучасным абсталяваннем. Ёсць апарат для поўнага спектральнага аналізу крыві, бадай, адзіны ў Мінскай вобласці. Установа аховы здароўя ўкамплектаваная цалкам аўтамабілямі хуткай дапамогі, рэанімабілем, забяспечана медыцынскімі кадрамі. Прычым упэўнены, што многія маладыя медыкі хоць сёння могуць узначаліць бальніцы, — яны прафесійна, добра падрыхтаваныя. Часткова існуе праблема са спецыялістамі ў сельскай гаспадарцы: механізатараў крыху не хапае. Але падчас пасяўной, касавіцы, жніва патрэбу перакрываем за кошт працаўнікоў раёна. Дапамога сталічных прадпрыемстваў не патрабуецца.

***— Вы першы з кіраўнікоў, які звярнуў увагу на развіццё турыстычнага патэнцыялу раёна. Лічыце, што тут непачаты край работы?***

— Гэта сапраўды так. У Уздзенскім раёне пачынаецца Нёман. Але мала хто пра гэта ведае. Неабходна больш папулярызаваць гэты факт. У вёсцы Наднёман знаходзіцца сядзіба Наркевіча-Ёдкі. Якуб Наркевіч-Ёдка — вучоны-прыродазнавец, урач, вынаходнік бяздротавай перадачы электрычных сігналаў. Радавое гняздо гэтага незвычайнага чалавека, які пакінуў след не толькі ў беларускай, але і сусветнай гісторыі, можна раскруціць не горш, як Нясвіжскі палац. Але для гэтага патрэбныя фінансавыя сродкі. Сядзіба ўзвышаецца на крутым беразе Нёмана — надзвычай прыгожыя мясціны. Тут жа ўладкаваны склеп з магіламі Наркевічаў-Ёдкаў. У пасёлку Першамайск раскінуўся сядзібна-паркавы комплекс «Кухцічы» заможнага шляхецкага роду Завішаў, у Уздзе — капліца з пахаваннямі прадстаўнікоў іх сям'і.

Словам, наведвальнікам і гасцям ёсць што паказаць і пра што расказаць.

***— Вы, як кіраўнік новай фармацыі, наладжваеце самыя цесныя стасункі з прадстаўнічай уладай, дэпутатамі. Наколькі ведаю, новыя старшыні прыйшлі ў тры з шасці сельскіх саветаў.***

— Дзешчанскі сельвыканкам узначаліў новы старшыня, у мінулым участковы інспектар міліцыі, маёр Уладзімір Балцянкоў. Уважліва сачу за першымі яго крокамі. Думаю, не памыліліся ў выбары: ініцыятыўны, актыўны. У Азерскі сельвыканкам таксама прыйшоў малады хлопец Антон Аліноўскі, які працаваў у Мінску ў аддзеле па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Задаволены яго работай. Напачатку нават палохаў, што нялёгка яму давядзецца: населены пункт месціцца непадалёку ад Мінска, на лета сюды прыязджае шмат дачнікаў, якія прад'яўляюць завышаныя патрабаванні мясцовай уладзе. Але такіх, як ён, не спалохаеш цяжкасцямі. Напрыклад, на нарадах я стаўлю пытанне, каб у кожным сельсавеце стварыць падсобную брыгаду для дробнага рамонту, добраўпарадкавання. Дык ён падхапіў маю ініцыятыву, звязаўся з раённым цэнтрам занятасці насельніцтва, дамовіўся ўзяць на работу трох чалавек, якія стаяць там на ўліку, вырашыў пытанне з аплатай іх працы. Нёманскі сельвыканкам узначаліла Наталля Крук. Наталля Уладзіміраўна шмат увагі ўдзяляе навядзенню парадку на зямлі. Акрамя таго перавагу ў рабоце аддае пытанням працаўладкавання насельніцтва, напрыклад, яна склала спісы жыхароў усіх вёсак сельсавета, якія не маюць работы, у тым ліку і тых, хто выехаў на заробкі ў іншыя населеныя пункты, змяніў месца жыхарства. Па ўсіх катэгорыях прадаставіла дакладную раскладку.

***— Помніцца, мінулы раз пры сустрэчы ў Дзяржынску вы казалі, што з сям'ёй змянілі месца жыхарства, здаецца, шосты раз. Што зробіш, вы чалавек дзяржаўны, куды загадалі, туды і паехалі. Гэтым разам дзеці ўжо адаптаваліся?***

— У Узду пераехалі з сям'ёй перад Новым годам, вырашылі, што трэба сустракаць свята на новым месцы. Пасяліліся ў службовым доме і пачалі абжывацца з чыстага ліста.

Малодшая дачка ходзіць у чацвёрты клас, прывыкла да новых умоў, школы. Старэйшай цяжэй знаходзіць новых сяброў, ладзіць новыя стасункі. Бачыў, што напачатку ёй даводзіцца нялёгка. Таму кожны вечар стараўся падысці, пагутарыць, высветліць, як справы ў школе, падтрымаць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Таленты

# МУЗЫКА ВЫХОЎВАЕ МАЛЕНЬКІХ «ЦЭЗАРАЎ»

## Чаму дзяцей варта аддаваць у мастацкую школу

**У мінулым годзе Уздзенская дзіцячая школа мастацтваў адзначыла 50-годдзе.**

— У нас навучаецца 284 дзіцяці, у тым ліку 43 у класах, якія размешчаны ў пасёлку Каралёва. Працуюць 22 выкладчыкі. За ўсю гісторыю школы з яе сцен выйшла больш як тысяча выпускнікоў. Мы ганарымся, што маем два калектывы са званнем «узорны»: дзіцячы духавы аркестр і танцавальны калектыў «Вясёлка». У школе працуюць пяць аддзяленняў: інструментальнае, дзе выхаванцы вучацца іграць на гітары, домры, цымбалах, трубе, валторне, флейце, баяне, акардэоне, ударных інструментах. Ёсць аддзяленні харэаграфіі і харавое, мастацкае, мастацка-эстэтычнае. Найбольш ахвотна дзеці паступаюць на харэаграфію, выяўленчае мастацтва, — расказаў **дырэктар установы Дзмітрый КАНТАРОВІЧ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Юныя таленты Уздзеншчыны: (злева направа) Павел Прыёмка, Антон Лапотка, Станіслаў Майсеенка, Максім Макарэвіч.**

Па словах кіраўніка, у школе не хапае тэатральнага аддзялення. Магчыма ў перспектыве яно і адкрыецца. Але тут патрэбна карпатлівая і настойлівая праца, пошук спецыялістаў у гэтай справе.

— Музычныя заняткі выхоўваюць маленькіх «цэзараў», якія ўмеюць рабіць шмат спраў адразу. Музыка дапамагае арыентавацца адначасова ў некалькіх працэсах, прывучае мысліць і жыць у некалькіх напрамках, — лічыць Дзмітрый Якаўлевіч. — Нездарма музычным мінулым адзначана жыццё многіх знакамітых людзей.

*(Заканчэнне на стар. 8.)*

■ Цікавае побач

# ВОДНАЕ СЭРЦА КРАІНЫ



## Адкуль бярэ пачатак адна з найбуйнейшых нашых рэк?

**Нёман называюць самай беларускай з усіх рэк, якія цякуць па тэрыторыі нашай краіны і пасля ўпадаюць у мора. Бо толькі ён бярэ свой пачатак у Беларусі, а калі дакладней — у Уздзенскім раёне. Дарэчы, месца само па сабе вельмі цікавае: яно абвеянае мноствам паданняў і легендаў, а спрэчкі пра тое, які пункт лічыць сапраўдным вытокам Нёмана, не сціхаюць да гэтага часу.**

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

# АД НАШАГА СТАЛА — ВАШАМУ,

## або Што новага прапаноўвае Уздзенскае спажывецкае таварыства

**З кожным годам як грыбы пасля дажджу з'яўляюцца новыя сеткавыя магазіны. Аднак наша жыццё нельга ўявіць без кааператыўнага гандлю. Гэта менавіта тая галіна, якая робіць камфортным наш быт, стварае настрой сельскім працаўнікам. Карэспандэнт пабывала на Уздзеншчыне і ўпэўнілася, што выжывуць тыя таварыствы, якія ўзначальваюць нераўнадушныя людзі, якія пастаянна ў творчым пошуку.**




**Старшыня райспажыўсаюза Іван ГАРАВЕЦ.**

Уздзенскае раённае спажывецкае таварыства вядзе свой адлік з 1923 года. За гэты час неаднаразова мяняліся назвы, шыльды, але нязменным заставаўся клопат аб людзях. У сістэму спажывецкага таварыства ўваходзіць 70 рознічных гандлёвых аб'ектаў, у тым ліку 58 у сельскай мясцовасці. Ахопліваюць нават тыя вёскі, дзе пражывае ўсяго некалькі чалавек.

Прадпрыемства займаецца не толькі гандлем. Гэта разгалінаваная шматпрофільная сістэма, якая забяспечвае патрэбы жыхароў у грамадскім харчаванні, прымае ад насельніцтва лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі, дары лесу. Усё, што людзі здаюць, перапрацоўваецца. У выніку пакупнікі могуць набыць на паліцах гандлёвых пунктаў квашаную капусту, салёныя агуркі, памідоры, мочаныя яблыкі, ягаднае варэнне. Спажывецкае таварыства пастаянна працуе над пашырэннем асартыменту вырабаў з агародніны і садавіны. Цяпер, напрыклад, рэцэпт карэйскай морквы на ўзгадненні ў інстытуце Нацыянальнай акадэміі навук. Уздзенскія кааператары выпускаюць гарчыцу, маянэз, селядзец, у асобным вытворчым цэху займаюцца разбіраннем курэй.



**Ірына СМАЛЯНКА, прадавец у краме «Ласунак».**

У прадпрыемства ёсць і свой прамысловы аддзел. Тут выпускаюць тарты, выпечку, хлебабулачную прадукцыю. У каўбасным цэху — шмат відаў мясных вырабаў, каўбас. Усе прадукты натуральныя: акрамя спецый, у іх няма ніякіх дабавак. Тое ж самае датычыцца і выпечкі, хлеба, печыва, тартоў. Менавіта гэтым уздзенская прадукцыя адрозніваецца ад прадукцыі іншых вытворцаў. Але мінус у тым, што абмежаваны тэрмін яе рэалізацыі. Сеткавыя магазіны зацікаўлены, каб прадукты захоўваліся працяглы час і не чарсцвелі.

### ВЫХАД — У РАЗВІЦЦІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Вядома, цяпер даводзіцца працаваць ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Таму старшыня праўлення спажыўтаварыства Іван Гаравец бачыць выйсце ў развіцці прамысловасці і атрыманні канчатковага выніку: самі вырасцілі, перапрацавалі і прадалі. Менавіта па такім прынцыпе працуюць шведскія калегі.

— Задумваемся над тым, што нядрэнна мець сваю падсобную гаспадарку, забойны цэх, кармавую базу. На корм можна выкарыстоўваць і адходы вытворчасці. Цяпер пакупнік клапоціцца аб здаровым ладзе жыцця, харчаванні. Таму ўсё большым попытам карыстаюцца натуральныя, экалагічна чыстыя прадукты, — дзеліцца планамі Іван Іванавіч. — Хочам таксама мадэрнізаваць каўбасны цэх для таго, каб выпускаць вараныя каўбасы. Для гэтага неабходна закупіць спецыяльнае абсталяванне. Мяркую, у чацвёртым квартале пытанне зрушым з месца. У гэтым выпадку ў гандлі будзе прысутнічаць увесь спектр каўбасных вырабаў. На сённяшні дзень мы вырабляем практычна ўсё, за выключэннем вараных каўбас. Распрацоўваем таксама новыя тэхналогіі, каб патанніць прадукцыю. Выпускаем пельмені з курацінай, ялавічынай, свінінай пад брэндам «Браткі Пельменікі». Гэта таксама стапрацэнтны натуральны прадукт, без соі, дабавак. Тэрмін яго захоўвання тры месяцы. Навінка ўжо знайшла сваіх прыхільнікаў.

Па меры магчымасці ва Уздзе мадэрнізуюць гандлёвую сетку. Апошнім часам магазіны пераводзяць на самаабслугоўванне, абнаўляюць дызайн, інтэр'ер у старых гандлёвых пунктах. Словам, робіцца ўсё, каб яны набывалі прывабны сучасны выгляд, а пакупнікам і прадаўцам было тут утульна, камфортна. Нядаўна адкрылася фірменная крама «Крышталь». Усе шыльды ў краме на беларускай мове, у тым ліку і інфармацыя ў кутку пакупніка.

### НЕ ТОЛЬКІ ХЛЕБА, АЛЕ І ВІДОВІШЧАЎ

У раённым цэнтры адкрыўся магазін «Ласунак» для дзяцей. Гэты гандлёвы пункт яшчэ сумяшчае і функцыі кафэ. Тут аформлены ўтульны куток для гульняў, месца са столікамі, дзе можна пасядзець, выпіць кавы, гарбаты, кактэйль, паспытаць піражнае, іншыя салодкія прысмакі, папкорн. У асноўным наведвальнікам прапануюць прадукцыю асабістай вытворчасці. У найбліжэйшай перспектыве ўстановяць абсталяванне для вырабу салодкай ваты. «Нашы дзеці могуць паласавацца ёй толькі падчас розных гарадскіх свят, кірмашоў. А цяпер яны — атрымаюць магчымасць ужываць яе, калі пажадаюць, — кажа кіраўнік райспажыўсаюза. — Калі пацяплее, на вуліцы паставім парасон, сталы, каб наведвальнікі маглі выпіць ахаладжальныя напоі, з'есці марожанае.

— Працуем мы з 7 сакавіка гэтага года, але людзі ўжо паспелі ацаніць наш асартымент, прыходзяць сем'ямі, ладзяць для малых дні нараджэння, — кажа прадавец Ірына Смалянка. — Прадукцыя ў нас свежая, завозіцца кожную раніцу.

— У планах — на базе аднаго з гарадскіх кафэ адкрыць вячэрнюю дыскатэку для моладзі. А ў рэстаране ладзіць шоу, канцэрты, запрашаць артыстаў. Цяпер для людзей важна не толькі пасядзець ва ўтульнай зале, смачна паесці, выпіць добрага напою, адпачыць. Яны хочуць розных відовішчаў. Пакуль шукаем музыкантаў, людзей, якія б маглі прафесійна правесці мерапрыемствы», — кажа Іван Гаравец.

У сельскай мясцовасці, наадварот, незапатрабаваныя магазіны закрываюцца. Яны нерэнтабельныя з-за невялікай выручкі. Шмат цягнуць камунальныя паслугі, электрычнасць, а льгот ніякіх няма. Але сельскія жыхары не застаюцца без увагі кааператараў. Пяць аўтамагазінаў па графіку абслугоўваюць 108 населеных пунктаў. Магазіны на колах аснашчаны халадзільным абсталяваннем, прывозяць усё неабходнае: рыбныя, мясныя, каўбасныя, малочныя, хлебабулачныя вырабы. Заадно прадаўцы могуць выканаць і індывідуальны заказ: у наступны раз даставяць тое, што пажадае пакупнік.

«У перспектыве пры неабходнасці будзем расшыраць аўтапарк і пускаць дадатковыя маршруты, — канстатуе старшыня райспажыўсаюза. — А наогул, нерэнтабельныя магазіны трэба закрываць і рабіць стаўку на тыя віды дзейнасці, якія прыносяць прыбытак, на тое, што ў нас лепш атрымліваецца — развіваць вытворчасць. Мы дабіваемся таго, каб не залежаць ад пабочных пастаўшчыкоў. Дарэчы, хлебабулачныя вырабы мы рэалізуем не толькі ў сваім раёне, але і ў іншых — Мінскім, Пухавіцкім, Слуцкім, Капыльскім, Дзяржынскім, ахопліваем бараўлянскі напрамак».



**Святлана СТРЫГЕЛЬСКАЯ, начальнік аддзела прамысловасці, з прадукцыяй уласнай вытворчасці.**

### НА ЧАРЗЕ ЭЛІТНЫ ХЛЕБ

Начальнікам аддзела прамысловасці працуе Святлана Стрыгельская, на прадпрыемстве з 1999 года.

— У нас ёсць свая лабараторыя, тэхналагічная служба, якая распрацоўвае рэцэптуры і ўкараняе іх у вытворчасць. Маем свае цэхі: хлебапячэння, цукрыстых, кандытарскіх вырабаў. У кожнай змене працуюць па чатыры-пяць чалавек, — расказала Святлана Віктараўна. — У цэху хлебапячэння выпускаем хлеб, батоны, разнастайную выпечку: здобу, сухары. У цэху цукрыстых вырабаў — пернікі і разнастайныя віды печыва. У кандытарскім — тарты, пірожныя і дробнаштучную прадукцыю. У распрацоўцы тэхнолагаў — новыя найменні тартоў, пірожных. Але перш вывучаем густы і попыт спажыўцоў. Гатуем два віды заказных тартоў. Па іх прыязджаюць жыхары нашага і суседніх раёнаў.

Як расказала Святлана Стрыгельская, у планах — выпечка хлеба ў чатыры стадыі. Гэта будуць элітныя заварныя віды. Працэс іх прыгатавання складаны: спачатку рыхтуецца закваска, заварка, затым дадаецца закваска пасля браджэння. Але на выхадзе атрымліваецца смачны, з водарам хлеб без дабавак, узмацняльнікаў смаку, які доўга не чарсцвее.

У задумах таксама хлеб без дражджэй для тых, хто клапоціцца аб здаровым ладзе жыцця, харчаванні. Але выпуск новых відаў хлеба зацягваецца па прычыне дэкларавання прадукцыі. Перш чым запусціць іх у вытворчасць, неабходна правесці гэтую працэдуру і атрымаць неабходныя дакументы.

Па кандытарскіх вырабах шмат планаў. У прыватнасці, выпускаць іх на аснове тварожных крэмаў, фруктаў. «Тэрмін іх захоўвання невялікі. Але будзем адпрацоўваць гэты варыянт, бо людзям падабаюцца такія ласункі», — канстатуе мая суразмоўніца.

Калісьці каўбасны цэх займаўся варанымі каўбасамі, сасіскамі, сардэлькамі. Цяпер вытворчасць іх хочуць аднавіць. Прычым выпускаць каўбасы розных гатункавых катэгорый. Вялікім попытам карыстаюцца сыравэнджаныя і сыравяленыя каўбасы па даўнішніх бабуліных рэцэптах. Па іх нават прыязджаюць у фірменны магазін спецыяльна жыхары Мінска. Даспадобы пакупнікам і сухары з разынкамі «Гомельскія», іх бяруць цэлымі каробкамі.

— Сваю прадукцыю рэалізуем праз сістэму спажывецкіх таварыстваў практычна ва ўсіх раёнах Міншчыны, у сталіцы. Часта ўдзельнічаем у кірмашах, выстаўках, дэгустацыях. І аднойчы пакаштаваўшы нашы вырабы, пакупнікі цікавяцца, дзе іх можна набыць, — адзначае Святлана Стрыгельская.

У размову зноў уступае Іван Гаравец:

— Змены адбыліся і ў сістэме грамадскага харчавання. Мы распрацавалі два комплексы танных абедаў коштам крыху больш за два рублі. Людзі ацанілі паслугу, бо з любога комплексу можна выбраць тое, што ім да густу. У абедзенны перапынак зала рэстарана практычна не пустуе. Па такім жа прынцыпе працуюць і тры кафэ ў горадзе. Людзі кажуць, што за такія грошы ў сталіцы можна купіць толькі чабурэк. У нас новы старшыня райвыканкама Сяргей Канстанцінавіч Савіцкі, вельмі крэатыўны чалавек, дапамагае нам парадамі, падкінуў нават бізнес-план. Я ўпершыню сутыкнуўся з тым, што кіраўнік так перажывае за справу, за свой раён. Думаю, пры такім падыходзе да ўсіх галін вытворчасці ў яго ўсё атрымаецца.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** УНП 600109808

# Сучасныя тэхналогіі, клопат пра работнікаў і нетыповыя паслугі

## КАЛІ РАЁННАЯ АХОВА ЗДАРОЎЯ НА ЎЗРОЎНІ СТАЛІЧНАЙ



**У 80-я гады мінулага стагоддзя Уздзенскую цэнтральную раённую бальніцу будавалі як эксперыментальны праект. Тады яна была адной з найлепшых па аснашчэнні ў БССР. Гады прайшлі, але свой лідарскі статус бальніца не страціла. Тут ёсць сучаснае абсталяванне, якога няма больш ні ў адным раёне. Зараз ва ўстанове аховы здароўя праводзіцца маштабная мадэрнізацыя. Якімі яшчэ дасягненнямі ганарацца супрацоўнікі, а якія змены яшчэ толькі ў планах, мы даведаліся, наведаўшы Узду.**

### «Без прафесіяналаў няма развіцця»

Больш за дзесяць гадоў пост **галоўнага ўрача Уздзенскай цэнтральнай раённай бальніцы займае Аляксандр ДРЭЙЧУК.** Менавіта пасля таго, як ён стаў кіраўніком, тут пачаліся вялікія перамены: бальніца не раз станавілася пераможцам рэспубліканскага агляду якасці і медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. У прафесіі Аляксандр Аляксандравіч ужо амаль 35 гадоў, у якасці спецыялізацыі ён абраў педыятрычны кірунак, што дзіўным чынам спалучаецца з яго яскравымі лідарскімі якасцямі. Дарэчы, сваю энергію ён накіроўвае не толькі на развіццё даручанай яму ўстановы, але і на грамадскую дзейнасць: галоўны ўрач раённай бальніцы быў абраны ў абласны Савет дэпутатаў ад Уздзенскай выбарчай акругі. Сярод галоўных задач сваёй працы Аляксандр Аляксандравіч называе замацаванне кадраў і абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

— Без прафесіяналаў няма развіцця. Таму неабходна ствараць годныя ўмовы і забяспечваць добры заробак. Мы над гэтым узмоцнена працуем, што дае свае вынікі: у нас высокая ўкамплектаванасць медыцынскім персаналам. Моладзь прыязджае на практыку, праходзіць інтэрнатуру, размеркаванне і застаецца. Мы стараемся іх зацікавіць: мясцовыя гаспадаркі выдзяляюць домікі ў аграгарадках, самі адрамантавалі некалькі інтэрнатаў, будуем арэнднае жыллё. І, вядома, не забываем аб чалавечым стаўленні. Я, напрыклад, адчуваю вялікую адказнасць перад моладдзю, і стаўлюся да іх шчыра, па-бацькоўску, — расказвае галоўны ўрач.



Галоўны ўрач Уздзенскай ЦРБ Аляксандр ДРЭЙЧУК.

Што датычыцца абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы, то некалькі гадоў назад ва ўстанове аховы здароўя пачаўся рамонт, які паэтапна закране ўсе аддзяленні. Ужо цалкам гатова аддзяленне рэабілітацыі, напалову — інфекцыйнае аддзяленне, адрамантаваная пральня, харчблок. З дзевятнаццаці цалкам мадэрнізаваны 14 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, у іх зрабілі сучасны касметычны рамонт, правялі водаправод, пячное ацяпленне замянілі цэнтральным. Дарэчы, у самой бальніцы ёсць свая кацельня, якая працуе на мясцовых відах паліва. Гэта дазваляе знізіць кошт адной гігакалорыі ў тры разы, а таксама самастойна рэгуляваць час уключэння ацяплення.

Аб планах Аляксандр Аляксандравіч гаварыць не вельмі любіць. «Давайце мы ўсё даробім, а потым вам раскажам. Пакуль можна паглядзець на тое, што ўжо гатова. А ганарыцца нам, праўда, ёсць чым», — адзначае галоўны ўрач.

### Узорная клінічна-дыягнастычная лабараторыя

Яшчэ адзін гонар Уздзенскай цэнтральнай раённай бальніцы — клініка-дыягнастычная лабараторыя. Тут устаноўлены імунаферментны аўтаматычны аналізатар. Абсталяванне такога класа ёсць хіба што ў НДІ анкалогіі. Цалкам аўтаматызаваная сістэма дазваляе звесці да мінімуму ўплыў чалавечага фактару на працэс, а значыць, і вынік даследавання, паскорыць работу супрацоўнікаў і атрымаць вынік у дзень здачы аналізу.



Урач-тэрапеўт Анастасія ДУБІНСКАЯ на прыёме.

— З яго дапамогай мы робім даследаванне на TORCH-інфекцыі для цяжарных, вывучаем палавыя гармоны і гармоны шчытападобнай залозы, анкамаркёры яечнікаў, малочнай, шчытападобнай і падстраўнікавай залоз, печані, кішэчніка. У гэтым месяцы пачынаем рабіць новыя аналізы лімфатычных захворванняў і комплексны скрынінг лёгкіх і малочнай залозы. Так, раённая бальніца не можа забяспечыць поўную загружанасць прыбора, затое гэта дазволіць яму працаваць больш дакладна і доўга. У цэлым, дзе гэта магчыма, мы стараемся перайсці на цалкам аўтаматызаваны аналіз, — тлумачыць **загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі Ірына СІЗОВА.**



Загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі Ірына СІЗОВА.

### «З'язджаць? Ды навошта!»

У Уздзенскай раённай бальніцы спецыялісты робяць усё магчымае, каб аказваць сваім пацыентам медыцынскую дапамогу на месцы, а не адпраўляць іх у сталіцу. Для гэтага некалькі гадоў таму ў хірургічнае аддзяленне набылі лапараскапічную стойку. Цяпер тут робяць аперацыі з мікрадоступам, гэта значыць пры дапамозе зусім невялікіх надрэзаў. У адрозненне ад больш траўматычных аперацый часу на аднаўленне патрабуецца ў разы менш. З дапамогай стойкі выконваюць выдаленне жоўцевых пузыроў, нядаўна пачалі апераваць апендыцыт.



Загадчык хірургічнага аддзялення Яўген СЕРАФІМАЎ і старшая аперацыйная медсястра Наталля КІЦІКАВА.

Не часта можна сустрэць у раённых бальніцах і аргонаплазмены каагулятар. З яго дапамогай можна, кажучы простай мовай, залітоўваць раны. Каагулятар ужываецца як падчас адкрытых, так і падчас закрытых аперацый. Аднойчы яго выкарыстоўвалі нават у гінекалагічнай аперацыі пры апаплексіі яечніка, прычым удалося захаваць і яечнік, і матачную трубу.

— Мы на месцы праводзім і некаторыя высокатэхналагічныя аперацыі. Сярод іх трансплантацыя часткі косткі з картыкальным пластом, камбінаваная аперацыя брушной поласці з сумежнымі органамі, напрыклад, участка печані і кішэчніка, — расказвае загадчык хірургічнага аддзялення, **урач-хірург вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Яўген СЕРАФІМАЎ.**

У гэта ж аддзяленне паўтара года таму па размеркаванні быў адпраўлены **Уладзіслаў ГАЎРУСІК.** Малады хірург родам з Гродна, дзе і скончыў медыцынскі ўніверсітэт. Пры гэтым накіраванне ў раён яго ніколькі не расчаравала. Уладзіслаў адзначае, што ў гэтым ёсць свае перавагі. Напрыклад, даводзіцца рабіць абсалютна разнапланавыя аперацыі, што добра для набыцця практычнага вопыту. Да таго ж, прыцягваюць хлопца ўмовы працы і побыту. Нядаўна яму выдзелілі трохпакаёвы блок у абноўленым інтэрнаце. Уладзіслаў усміхаецца, што ў яго нават няма столькі рэчаў для такой прасторы. Але ўлетку ўсё павінна памяняцца: малады чалавек плануе змяніць сацыяльны статус і прывесці жонку менавіта сюды. Дарэчы, па спецыяльнасці яна таксама ўрач. Так што ва Уздзе павінна з'явіцца новая ўрачэбная сям'я, паколькі пераязджаць малады спецыяліст нікуды не збіраецца.

### Будучыня за ўрачамі агульнай практыкі

Усяго ў склад установы аховы здароўя акрамя самой бальніцы ўваходзіць 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў і шэсць амбулаторый. Па словах **намесніка галоўнага ўрача па медыцынскім абслугоўванні насельніцтва Вадзіма ЛАБАНКА,** тэндэнцыя сучаснай медыцыны, каб тэрапеўты і ўчастковыя дактары перакваліфікаваліся ва ўрачоў агульнай практыкі. Гэта значыць, апроч навыкаў тэрапеўта, урачы павінны валодаць ведамі ў неўралогіі, оталарынгалогіі, лячэнні вочных хвароб і гэтак далей. Каб пры падазрэнні на паталогію ўрач не накіроўваў пацыента да вузкага спецыяліста, а мог паставіць дыягназ і прызначыць лячэнне самастойна. Асабліва актуальна гэта для сельскай мясцовасці, дзе пераважны працэнт пажылога насельніцтва, якому не так проста дабрацца ў горад. Цяпер працэс пераходу да новай сістэмы ў Уздзенскім раёне практычна завершаны. Але тым не менш раз на месяц вузкія спецыялісты працягнуць выязджаць у сельскія філіялы, каб падрабязна пракансультаваць усіх, хто жадае.



Намеснік галоўнага ўрача Вадзім ЛАБАНОК.

Наогул у рабоце Уздзенскага раённага апарата аховы здароўя задзейнічана больш за 600 чалавек. Раней у яго склад уваходзілі сельскія бальніцы, але практыка паказала, што яны нерэнтабельныя. Цяпер мясцовыя жыхары накіроўваюцца ў раённую бальніцу, дзе ім аказваюць кваліфікаваную дапамогу. Усяго ў стацыянары 161 ложка-месца.



Галоўная медсястра Жанна ЛІПАЙ.

— У раёне таксама ёсць бальніца сястрынскага догляду ў вёсцы Целякова, разлічаная на 25 месцаў. Там знаходзяцца адзінокія пажылыя людзі і тыя, ад каго адмовіліся іх дзеці. Гэта праблема, на жаль, стаіць даволі востра. Акрамя гэтага для пакінутых старых у стацыянары выдзелена 25 месцаў. Аформіць іх у дом-інтэрнат можна толькі ў выпадку, калі яны адзінокія або іх дзеці гатовыя даплачваць пэўную суму. Але часцей яны проста застаюцца без догляду і турботы. Мы не можам пакінуць іх без увагі, таму гэтую функцыю бяром на сябе, — адзначыла **галоўная медсястра бальніцы Жанна ЛІПАЙ.**

У бліжэйшы час Уздзенскую раённую бальніцу чакаюць чарговыя перамены — пераход на электронныя рэцэпты і электронную амбулаторную картку, амаль усё для гэтага ўжо гатова. Галоўнай задачай па-ранейшаму застаецца завяршэнне рамонту. Таксама ёсць задумка пераабсталяваць інфекцыйнае аддзяленне ў гасразліковы рэабілітацыйны цэнтр. Узровень інфекцыйнай захваральнасці зніжаецца, таму такія вялікія плошчы аддзяленню, на шчасце, цяпер не патрэбныя. Можа атрымацца нешта накшталт шматфункцыянальнага санаторыя проста ў горадзе.

**Дар'я КАСКО.**

### Сеанс араматэрапіі ў жамчужнай ванне

Далей накіроўваемся ў цалкам мадэрнізаванае аддзяленне рэабілітацыі. На працэдуры ў кабінет гідратэрапіі з задавальненнем прыходзяць не толькі мясцовыя жыхары, але і мінчане, якія перабіраюцца ва Уздзенскі раён у цёплую пару года. Тым больш што цэны на платныя паслугі, у адрозненне ад сталічных, зусім не кусаюцца. Кабінеты сталі настолькі запатрабаванымі, што ў бальніцы нават выпусцілі падарункавыя сертыфікаты на іх наведванне, якія карыстаюцца асаблівай папулярнасцю ў перыяд свят.

У адным з кабінетаў гідратэрапіі, напрыклад, можна знайсці душ Шарко, струменны і ўзыходзячы душы, у іншым — падводны душ-масаж і жамчужную ванну. Такую назву яна атрымала дзякуючы бурбалкам, якія яе напаўняюць, — па форме яны нагадваюць жамчужынкі. Працэдуры паляпшаюць кровазварот і лімфазварот, дзякуючы таму, што праводзіцца масаж усяго цела: ад пятак да шыі — што прыводзіць да агульнага аздараўлення арганізма. Іх можна суправадзіць і араматэрапіяй, на выбар прапануюць экстракт ядлоўцу, горнай лаванды, мелісы і размарыну. Як расказала **старшая медсястра аддзялення медыцынскай рэабілітацыі Наталля ЛІСАКОВІЧ,** рэкамендуецца праходзіць курс у 10—15 працэдур раз у квартал.



Старшая медсястра аддзялення медыцынскай рэабілітацыі Наталля ЛІСАКОВІЧ дэманструе душ Шарко, узыходны і цыркулярны. Таксама ёсць падводны душ-масаж і жамчужная ванна.

### Укол выратавання

Адзін з найважнейшых леташніх набыткаў для бальніцы — рэамабіль. Купіць яго дапамог Уздзенскі райвыканкам. Нягледзячы на вялікія выдаткі, пераацаніць гэта ўкладанне нельга. Рэамабіль цалкам укамплектаваны для аказання экстраннай рэанімацыйнай медыцынскай дапамогі і транспарціроўкі цяжкіх хворых.

— Тут вельмі шырокі салон, можна стаяць на ўвесь рост, кабіна з салонам злучаецца дзвярыма, яркае асвятленне — усё зроблена, каб стварыць максімальна зручныя ўмовы для працы ўрача. Абсталяванне таксама ўсё неабходнае. Напрыклад, кардыяманітор для кантролю сардэчнай дзейнасці, насычэння кіслародам, ціску. У выпадку неабходнасці можна правесці дэфібрыляцыю і электракардыёстымуляцыю. Таксама тут усталяваны пераносны апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх і электраадсмоктвальнік, — паказвае тэхніку **загадчык аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі Міхаіл ЗЫКАЎ.**

Апроч іншага ў рэамабілі заўсёды ёсць запас найкаштоўнейшых лекавых прэпаратаў. Напрыклад, танэктаплазу ўводзяць падчас буйнаачаговага інфаркту. Калі тромб закрывае сасуд, надыходзіць ішэмія — кіслароднае галаданне сардэчнай мышцы. Гэты тромб можна ўмоўна «растварыць» прэпаратам. Пасля яго ўвядзення аднаўляецца кровазабеспячэнне сардэчнай мышцы, тым часам чалавека вязуць у Мінск, дзе яму робяць ангіяграфію і пры неабходнасці ставяць адмысловую спружыну, якая расшырае сардэчны сасуд. Сэрца пачынае насычацца кіслародам нармальна, дзякуючы чаму атрымліваецца пазбегнуць незваротных наступстваў. Прэпарат дарагі, але вельмі эфектыўны. Дзякуючы яго своечасоваму ўвядзенню, толькі за мінулы год удалося выратаваць жыцці больш як 10 чалавек.



Яшчэ адна «навінка», якая з'явілася летась, — лічбавы рэнтген-апарат. Як расказвае **загадчык рэнтгенаўскага аддзялення Ірына БАЛЯКОВА,** да з'яўлення новага абсталявання спецыяльна падрыхтавалі кабінет: узмацнілі радыяцыйную абарону сцен, столі, памянялі дзверы, усталявалі адмысловую вентыляцыю з функцыяй падагрэву. Дзякуючы таму, што комплекс лічбавы, павялічваць прастору не прыйшлося — па нарматывах няма неабходнасці вылучаць для яго вялікія плошчы.

Апарат складаецца з некалькіх частак, з дапамогай якіх можна праводзіць скапічныя, калі за працай унутраных органаў можна назіраць у рэжыме анлайн, і рэнтгенаграфічныя даследаванні як у стаячым, так і ў ляжачым становішчы пацыента. Але галоўная перавага гэтага комплексу ў тым, што для яго работы не патрэбная дарагая плёнка. Даныя запісваюцца на спецыяльныя касеты, якія можна выкарыстоўваць шматразова, пасля чаго літаральна некалькі хвілін яны апрацоўваюцца ў адмысловым прыёмніку. Гатовы здымак можна раздрукаваць на паперы, запісаць на дыск або флэшку, а таксама па электроннай пошце наўпрост накіраваць урачу, які вядзе пацыента. Гэта не толькі вельмі зручна, а ле і дазваляе істотна эканоміць.



Урач-рэнтгенолаг БАЛЯКОВА Ірына паказвае новы рэнтген-апарат беларускай вытворчасці.

УНП 600119348.




На павароце да вёскі Слабада Уздзенскага раёна ўладкаваны ўказальнік з назвай «ААТ «Асілак», аздоблены чырвонай зоркай.

— Раней тут быў калгас «Звязда», аднайменны з вашай газетай. Затым ён стаў сельскагаспадарчым вытворчым кааператывам. Пры пераходзе ў новы статус мы не маглі пакінуць папярэднюю назву, бо ў краіне была не адна «Звязда»: такая ўмова была вылучана для ўсіх былых СВК краіны. У адпаведнае ведамства мы перадалі спіс з дваццаці назваў. Сярод іх быў і «Асілак». Такога найменння да нас яшчэ ніхто не прапаноўваў. Вось так мы і сталі тым, хто ёсць да гэтага часу. У выніку давялося памяняць шыльду пры ўездзе, а вось зорку, як сімвал нашай гісторыі, пакінулі. Мы павінны шанаваць свае карані, ведаць сваю гісторыю. Хто не шануе свайго мінулага, у таго няма будучыні, — лічыць **дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства Валерый МАЙСЮК.**

Цяперашняя назва гаспадаркі таксама сімвалічная і абавязвае быць прыкладам для іншых, не спыняцца на дасягнутым, пастаянна ўдасканальвацца. Гэта і зразумела: асілак — моцны, дужы, якому па плячы любыя задачы, што ставіць кіраўніцтва краіны, вобласці і раёна.

І сельгасарганізацыя, на мой погляд, спраўляецца з гэтым. Пра што сведчыць прыклад самога дырэктара. У мінулым кіраўнік дзяржавы ў ліку іншых прадстаўнікоў розных сфер эканомікі ўручыў ордэн Пашаны і Валерыю Уладзіміравічу. Прэзідэнт тады падкрэсліў, што высокіх вынікаў у сваёй дзейнасці дабіваюцца людзі, якія на першае месца ставяць адказныя адносіны да справы.

# «АСІЛАК — ГЭТА СІЛА»

## Адкрытае акцыянернае таварыства імкнецца апраўдваць сваю назву

## НАПЕРАД І ТОЛЬКІ НАПЕРАД

Два гады запар гаспадарка — у 2016-м і 2017-м — была занесена на раённую Дошку гонару і ўзнагароджана Пераходным чырвоным сцягам за значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна.

— Вядома, гэтая пачэсная адзнака, прызнанне заслуг усяго калектыву, абавязвае нас не зніжаць тэмпаў. Калі будзем спатыкацца, буксаваць, не імкнуцца ісці наперад, то людзі скажуць: «Якія ж гэта сцяганосцы?», — лічыць Валерый Уладзіміравіч. — Узнагарода падштурхоўвае нас да большай адказнасці, вынікаў, далейшага ўдасканалення.

У «Асілку» вельмі дружны і прафесійны калектыў. Тут не прыжываюцца шукальнікі лёгкага хлеба і дармовага заробку. Валерый Майсюк у раёне працуе з 1976 года. Пачынаў працоўную дзейнасць з пасады брыгадзіра, прайшоў усе прыступкі службовай лесвіцы і вось ўжо больш за дваццаць гадоў узначальвае гаспадарку. Сур'ёзны вопыт дапамагае разбірацца ў людзях, правільна падбіраць кадры.

— У нас сфарміраваўся асноўны касцяк спецыялістаў, якія працуюць не адзін год. Адзінае, што турбуе, — недахоп ветэрынарных урачоў. Дакладней, маладыя спецыялісты, якія прыходзяць да нас пасля заканчэння навучальных устаноў, не затрымліваюцца: адпрацавалі па размеркаванні — і сыходзяць, — канстатуе мой суразмоўнік. — Такая сітуацыя ў большасці сельгасарганізацый краіны. І тлумачыцца вельмі проста. Усё больш жыхароў і вялікіх, і сярэдніх, і малых гарадоў абзаводзяцца хатнімі гадаванцамі: сабакамі, катамі, папугаямі і нават экзатычнымі жывёламі. Адпаведна, попыт нараджае прапанову: з'яўляюцца новыя ветэрынарныя клінікі, станцыі. Таму ветурачы ў іх запатрабаваныя спецыялісты.

— Я неаднаразова кажу маладым: вы думаеце, я з вас шмат патрабую, раблю заўвагі, загружаю работай? Успомніце мяне, калі станеце кіраўнікамі, калі ў вас у падпарадкаванні будуць людзі. А ў цэлым моладзь стараецца. І мы яе хочам навучыць на практыцы. Зразумела, што не заўсёды студэнтам хапала практычных заняткаў падчас вучобы, на вытворчасці.

Як лічыць Валерый Майсюк, самае лепшае замацаванне кадраў — калі прыезджы работнік, спецыяліст ажаніўся з мясцовай дзяўчынай, завёў дзяцей.

На пытанне пра эканамічныя, фінансавыя набыткі сельгасарганізацыі, змены, што адбыліся за час яго кіраўніцтва, дырэктар адказвае сціпла.

— У краіне шмат памянялася за дваццаць гадоў, з'явіліся новыя камп'ютарныя тэхналогіі, мабільная сувязь. Мы таксама нешта набылі з тэхнікі, пабудавалі. У прыватнасці, узвялі жывёлаводчы комплекс, які ўключае малочнатаварную ферму з даільнай залай на 400 галоў, цэх сухастою на 200 галоў, два цялятнікі — кожны на 200 галоў. На фермах правялі рэканструкцыю. Атрымалі нядрэнную ўраджайнасць цукровых буракоў — 620 цэнтнераў з гектара. У пераліку на бал-гектар занялі першае месца ў раёне. Штогод залужаем больш як 300 гектараў пад шматгадовыя травы. Для гэтых патрэб наладжана вытворчасць уласнага насення для бабовых і злакавых. Гэта наша кармавая база, а значыць, і якаснае малако, якое прыносіць асноўны прыбытак, дазваляе развівацца і павышаць дабрабыт работнікаў. Летась выйшлі на другое месца ў раёне па надоях малака — 6460 кілаграмаў на карову. У перспектыве будзем павялічваць пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Толькі за апошнія гады грамадскі статак прырос на 800 асобін. У планах — не спыняцца на дасягнутым.

Кіраўнік упэўнены, што з гэтым калектывам усё ў іх атрымаецца. «Людзі — наш залаты фонд», — кажа Валерый Майсюк.






Фота Сяргея ШАРАЯ.

**Перадавікі ААТ «Асілак» падчас уручэння пераходнага раённага сцяга ў 2017 годзе.
Злева направа: заслужаны механізатар і ветэран працы Аляксандр ОРСІК, галоўны заатэхнік Надзея БУШЫЛА, брыгадзір паляводчай брыгады Алена ПЯТРОВІЧ, дырэктар Валерый МАЙСЮК, аператар машыннага даення Алена ЖАРЫНОВА, загадчыца МТФ Наталля ЮРЧЫК, загадчыца МТК Святлана КУЙЧЫК, аператар па доглядзе цялят Марына ШАЛІМА.**

## БЕЗ МОЦНАЙ КАРМАВОЙ БАЗЫ НІ ТУДЫ І НІ СЮДЫ

Дзмітрый Цыўнэль — галоўны аграном. Прыйшоў у «Асілак» па размеркаванні шэсць гадоў таму пасля заканчэння Горацкай сельгасакадэміі. Спачатку працаваў вядучым аграномам, набраўся вопыту, зарэкамендаваў сябе з лепшага боку і пайшоў на павышэнне.



**Дзмітрый ЦЫЎНЭЛЬ, галоўны аграном.**

— Я нарадзіўся ў Браслаўскім раёне Віцебскай вобласці. Застаўся ў «Асілку» пасля адпрацоўкі, паколькі тут моцная гаспадарка, добры калектыў, талковы дырэктар. Таму не было сэнсу кудысьці бегчы, нешта шукаць. На Браслаўшчыне, вядома, вельмі прыгожыя мясціны, азёры, але там лепш адпачываць, чым працаваць. Наогул Мінская вобласць адрозніваецца ад Віцебшчыны па ўмовах працы і заробках у лепшы бок, — расказаў Дзмітрый Мечыслававіч.

Дзмітрый пазнаёміўся з мясцовай дзяўчынай, стварыў сям'ю, выхоўвае траіх дзяцей. Дачушкі — дашкольніцы, а маленькі сынок праз год пойдзе ў сад. Маладой сям'і гаспадарка выдзеліла катэдж з усімі выгодамі. Побач з домам прысядзібны ўчастак, дзе вырошчваюць бульбу, памідоры, агуркі, зеляніну. З жыўнасці — толькі куры і трусы, якіх трымаюць дзеля дзяцей, каб на стале для іх былі свежыя яйкі і мяса. Малако можна выпісаць і ў гаспадарцы, але яго купляюць у краме.

Хатняй гаспадаркай займаецца жонка. Муж з вясны да позняй восені — у полі. Дадому вяртаецца зацемна. Зразумела, што без намаганняў галоўнага агранома, яго прафесіяналізму нельга стварыць моцную кармавую базу. А без яе, як кажуць, і ні туды і ні сюды.

— Мы вырошчваем рапс, збожжавыя: трыцікале, пшаніцу. 1200 гектараў займае клін яравых, 500 гектараў азімых. Перавагу аддаём кукурузе і цукровым буракам. Гэтыя караняплоды даюць з кожным годам усё большую ўраджайнасць. Сёлета, напрыклад, атрымалі 620 цэнтнераў з гектара. Летась было 500 цэнтнераў на круг. У нас бедныя глебы, у асноўным пясчаныя, таму імкнёмся ўнесці поўны комплекс арганічных і мінеральных угнаенняў: азот, фосфар, калій. Плюс пяць праполак, фунгіцыдная апрацоўка.

Калі цукровыя буракі здаюць на ААТ «Слуцкі цукрафінадны камбінат», што прыносіць значны прыбытак, то кукурузу выкарыстоўваюць на корм жывёле. Гэтая культура змяшчае шмат спажыўных рэчываў.

У належным стане ў гаспадарцы ўтрымліваюць пашу для грамадскага статка, імкнуцца нарыхтоўваць кармы, так бы мовіць, з запасам, на паўтара года наперад. Асаблівая ўвага шматгадовым травам, якія пасеяны на плошчы больш як 700 гектараў, у тым ліку 200 гектараў люцэрны.

— Пры пасяўных работах, вырошчванні культур мы строга выконваем тэхналогіі. Падтрымліваем таксама сувязь з вучонымі, пры неабходнасці кансультуемся з супрацоўнікамі Інстытута земляробства ў Жодзіне, інстытута ахovы раслін, — кажа Дзмітрый. — Мы не можам працаваць абы-як, падводзіць свайго кіраўніка і ўсіх, хто ўскладае на нас надзеі. Ад нашай працы ў тым ліку залежыць харчовая бяспека краіны.

## СВОЙ СЯРОД СВАІХ

Механічны двор ААТ «Асілак» лічыцца найлепшым ва Уздзенскім раёне. Яго тэрыторыя заасфальтаваная. Беражліва тут ставяцца да тэхнікі, якая пасля завяршэння сельскагаспадарчых кампаній правяраецца, рамантуецца і ставіцца ў ангары і пад навесы на зімовае захаванне. Сёлета яшчэ ледзьве сышоў снег, а механізатары прыступілі да вывазу арганікі, падкормкі азімых. Усе трактары і аўтамабілі гатовы выйсці ў поле. Падрыхтоўка тэхнікі да пасяўной праводзілася пад пільным кантролем галоўнага інжынера Мікалая Шыдлоўскага. Заўсёды можна даверыцца вопыту і адказнасці механізатараў Андрэя Махнача, Аляксандра Бушылы, Аляксея Санковіча, Віталя Лычкоўскага, кіроўцы Анатоля Летуна. Яны не навічкі ў гаспадарцы. А вось механізатар Яўген Міхалковіч — чалавек новы, працуе тут з сакавіка мінулага года. Яму даверылі энерганасычаны трактар «Беларус-3522».

— Займаюся ў асноўным сяўбой збожжавых. Але і іншыя работы даручаюць: ворыва, дыскаванне. Летась, восенню, калі пайшлі дажджы падчас уборкі кукурузы і буракоў, давялося выцягваць гэтым волатам менш магутную тэхніку, што грэзла на палях, — адзначыў Яўген Мікалаевіч.

Яўген Міхалковіч раней працаваў у ААТ «Шацк» Пухавіцкага раёна. Але там не было жылля. Тут выдзелілі катэдж, дзе пасяліўся з сям'ёй — жонкай і маленькім сынам.

— Хацелася жыць сям'ёй у сваім доме. Таму пачаў шукаць новую работу. Дырэктар ААТ «Асілак» сказаў, што яму патрэбны маладыя спецыялісты, і ўзяў мяне на працу. І я стараюся апраўдваць яго давер, — падзяліўся са мной Яўген.

Як адзначыў Яўген Міхалковіч, у «Асілку ён прыжыўся: тут талковы кіраўнік, дружны калектыў, добрыя людзі, дастойная зарплата. І жонку задавальняюць умовы пражывання і быту. Яна па адукацыі эканаміст. А гэта значыць — падрыхтаваны спецыяліст для гаспадаркі.

У «Асілку» з павагай і беражліва ставяцца да падбору кадраў, прыцягваюць іх не толькі заробкамі, але і сацыяльнымі стымуламі. І многія прыезджыя ўсёй душой прыкіпелі да аграгарадка, гаспадаркі, якая іх прытуліла. Таму і не здзіўляе, што акцыянернае таварыства лідзіруе ў раёне па многіх сацыяльна-эканамічных паказчыках.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**



**Механізатар Яўген МІХАЛКОВІЧ працуе на трактары «Беларус-3522».**



**Механізатар Андрэй МАХНАЧ працуе на КВК «Палессе-80».**

## ЛЕПШЫ ВЫНІК — БОЛЬШЫЯ ЗАРОБКІ



**Злева направа: галоўны лабарант Валянціна ЗІЗЕКА, галоўны заатэхнік Надзея БУШЫЛА, аператар машыннага даення Ірына ВЯЛІЧКА, аператар па доглядзе цялят Марына ШАЛІМА, загадчыца малочнатаварнага комплексу Святлана КУЙЧЫК у лабараторыі малочна-даільнага блока.**

Дваццаць гадоў працуе ў «Асілку» галоўным заатэхнікам Надзея Бушыла, якая з душой ставіцца да любімай справы, калектыву. У многім дзякуючы яе намаганням, правільнаму падыходу да справы жывёлагадоўля мэтанакіравана развіваецца. Па выніках работы за мінулы год жанчына ўзнагароджана граматай камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама. Такую ж узнагароду Надзея Паўлаўна атрымала і ад упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Уздзенскага райвыканкама. Яна з задавальненнем паказала нам сваю гаспадарку.

— Жывёлагадоўчы комплекс «Слабада» мы ўвялі ў дзеянне ў 2013 годзе. Зрабілі рэканструкцыю двух клюшачнікаў, усталявалі новую дойку на 394 каровы. Усяго ж тут утрымліваецца 1827 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку цялушкі. Мы не купляем маладняк у іншых сельгасарганізацыях. Для ўзнаўлення дойнага статка выкарыстоўваем свой маладняк: на комплексе пабудавалі яшчэ і два цялятнікі. Цяпер мы доім штодзень па 19,8 кілаграма малака на карову. Гэта больш як на 2,5 кілаграма перавышае паказчык за аналагічны мінулагодні перыяд.

У «Асілку» функцыянуюць яшчэ дзве невялікія малочнатаварныя фермы. Таму пад апекай Надзеі Паўлаўны ўсяго 2200 жывёлін, у тым ліку 645 дойных.

Вядома, праца ў аператараў машыннага даення нялёгкая, распарадак дня, як у салдатаў. Ранішняя дойка пачынаецца з пяці гадзін і працягваецца да дзевяці. Затым кароткі адпачынак і зноў на ферму: з дванаццаці да дзвюх гадзін — абедзеная дойка. Вячэрняя доўжыцца з шасці да дзевяці.

— Праца дастойна аплачваецца — 600—900 рублёў у залежнасці ад якасці і колькасці малака, — кажа галоўны заатэхнік. — Акрамя таго, у даярак ёсць выходныя дзякуючы зменшчыцы. Вядома, жанчыны стараюцца: чым лепшы вынік, тым вышэйшыя заробкі, прэміі. Асаблівую ўвагу мы ўдзяляем якасці малака. Яна залежыць ад паглыбленай селекцыі, рацыёну і якасці кармоў, кармавога балансу. Кармавая база дазваляе павялічваць пагалоўе, а значыць, і надоі.

У 2015 годзе валавы надой на карову склаў 5304, у 2016-м — 5934, летась — 6420 кілаграмаў. Добрасумленна ставяцца да даручанай справы аператары машыннага даення кароў Ірына Вялічка, Алена Жарынава, Алена Лычкоўская, даглядчык маладняку Марына Шаліма і многія іншыя.

У пераможцах раённага спаборніцтва па вытворчасці прадукцыі і малочнатаварная ферма «Румок», якую каля дзесяці гадоў узначальвае Наталля Юрчык. На ферме таксама з кожным годам надойваюць усё больш малака. Разам з тым Наталля Сяргееўна не толькі паспяховы кіраўнік, але і тэхнік-асемянатар. Менавіта ад яе ведаў, прафесіяналізму залежыць высокі выхад прыплоду і ў канчатковым выніку — якасць пагалоўя.



**Ірына ВЯЛІЧКА, аператар машыннага даення, у даільнай зале.**



**Малочнатаварны комплекс «Слабада», ААТ «Асілак».**

УНП 600002374.

■ Падзея

# Мастацтва захопіць горад

## У фестывалю «Арт-Мінск» бяспройгрышная стратэгія, як дагадзіць усім

**«Горад ператворыцца ў адну вялікую галерэю» — даволі інтрыгуючымі словамі суправаджаюцца навіны пра будучы фестываль «Арт-Мінск», які пакажа не выставу, а некалькі выстаў, пройдзе не ў музеі, а на чатырнаццаці выставачных пляцоўках, прадэманструе не аднаго аўтара, а цэлы вобраз сучаснага беларускага мастацтва. Творы ў розных тэхніках, без абмежаванняў па ўзросце іх стваральнікаў, а ўсобных кураторскіх праектах з пэўнага пункта гледжання павінны стаць цэнтрам прыцягнення ўжо 27 красавіка. Фестываль «Арт-Мінск» — пакуль што навінка для сталіцы, прычым навінка з маштабным і самаўпэўненым стартам — мае быць адкрыты ўжо на наступным тыдні, а мы збіраем інфармацыю, каб зразумець, чаго чакаць.**

Канешне, вялікі замах не такі ўжо непрадказальны. Адным з арганізатараў фэсту з'яўляецца ўжо добра ў сферы культуры вядомы Белгазпрамбанк. Ён вяртае ў краіну беларускую мастацкую спадчыну накшталт Хаіма Суціна і Марка Шагала, фінансуе фестываль «ТЭАРТ», у найлепшых парыжскіх традыцыях асноўвае «Восеньскі салон», дзе творцы прадаюць свае работы, стварае культурніцкую пляцоўку «Ок16» на тусовачнай мінскай вуліцы Кастрычніцкай... Нарэшце, анансуе гарадскі фестываль — натуральнае свята — «Арт-Мінск», дзе мае быць паказана 250 работ, і адным з куратараў запрашае незалежнага арт-крытыка з Італіі.

Стэфана Антанэлі, той самы італьянскі «незалежны куратар», у сваю чаргу знаходзіць асаблівасці беларускага мастацтва і адной з іх называе сам факт падтрымкі банкам або камерцыйнай структурай сферы культуры. Маўляў, у Італіі такога ўжо няма.

Тым часам арганізатарамі (апроч Белгазпрамбанка, гэта «Газпрамтрансгаз Беларусь», Цэнтр візуальнасці і медыямастацтва «Новая культурная ініцыятыва» і Палац мастацтва), адборшчыкамі і куратарамі зроблена вялікая работа. Заклік падаваць заяўкі на ўдзел у фестывалі быў апублікаваны ў лютым — у выніку на разгляд экспертнай і невядомай нам камісіі прыйшло 810 твораў, з якіх для фестывалю «Арт-Мінск» і былі адабраныя тыя самыя 250 работ. Спісы твораў-удзельнікаў, дарэчы, ужо абнародаваны — тут мы знайшлі Алеся Родзіна, Ганну Сілівончык, Канстанціна Селіханава, Валерыя Шкарубу, Алега Ладзісава і іншыя добра вядомыя альбо пакуль што свежыя імёны.

У адрозненне ад «Восеньскага салона» на фестываль «Арт-Мінск» падаваць заяўкі маглі аўтары любога ўзросту і, дарэчы, любой нацыянальнасці, чаму сюды трапілі праекты з Літвы, Латвіі, Расіі і Эстоніі.

«Мы не так даўно знаходзімся ў асяродзі культурных праектаў, мастацтва, тэатра і ўсяго іншага, але тут у свой час мяне ўразіла замкнёнасць культурных суполак — галерэй, сяброў, кірункаў — шчыра кажучы, я быў у шоку, — распавядае **старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар БАБАРЫКА**. — Чамусьці нам падабаецца замкнуцца і песціць сваю асаблівасць, ідэнтычнасць. «Арт-Мінск» для банка — выдатны праект з дзвюх прычын. Па-першае, у ім няма практычна ніякіх абмежаванняў па ўзросце. А па-другое, да праекта далучылася вялікая колькасць удзельнікаў, якія да Белгазпрамбанка не маюць ніякага дачынення, але чамусьці паверылі, што ўдзельнічаць — будзе добра. На маёй памяці гэта першы праект такога маштабу, які аб'ядноўвае розныя ідэнтычнасці — галерэі, пляцоўкі, прадстаўнікоў і іншае. У гэтым — асноўная каштоўнасць праекта: мы развіваем рынак і мастацтва, а не кіруем і густ асобнага куратара ці пляцоўкі. Інакш кажучы, кожны з нас асаблівы, але гэтая асаблівасць павінна быць адкрытай і здольнай да камунікацыі з усім светам».

Пляцоўкамі фестывалю апроч галоўнай — Палаца мастацтва, які абяцае прадставіць куратарскую канцэпцыю Стэфана Антанэлі, — стануць Цэнтр сучасных мастацтваў, арт-гасцёўня «Высокае места», Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага, крэатыўная прастора «Ок16», галерэі «Ў», «ДК», «Арт-порт» і іншыя. Графік мерапрыемстваў і канкрэтныя планы па захопе горада мастацтвам арганізатары паабяцалі апублікаваць у панядзелак — знайсці іх можна будзе на адмысловым сайце праекта artminsk.by.

Дарэчы, незалежны куратар Стэфана Антанэлі, ад якога чакалі, што для сваёй выставы ён папросіць абмежаваную колькасць адабраных камісіяй мастакоў, замахнуўся больш чым на сотню, што можна лічыць прыгожым кампліментам. Ён жа адзначыў вялікую папулярнасць у нас візуальнага мастацтва — менавіта жывапісу, у той час як у Заходняй Еўропе больш распаўсюджанымі формамі з'яўляюцца інсталяцыя, фатаграфія і перформанс.

Фестываль «Арт-Мінск» — а нашы ад яго чаканні мяжуюць з пэўнай заінтрыгаванасцю, што з гэтага атрымаецца — працягнецца да 20 мая. Колькі мерапрыемстваў наведаць за амаль месяц яго работы — кожны вырашае сам.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

# Шэрагі мільёнаў чытачоў Васіля Быкава

**Калі класіка мастацкай літаратуры сапраўдная, то кнігі аўтара такіх твораў выдаюцца незалежна ад таго, колькі часу назад пайшоў з жыцця пісьменнік. Як і ў выпадку з літаратурнай спадчынай Васіля Быкава.**

Пра аўтара «Сотнікава» і другіх ваенных аповесцяў, кожная з якіх з'яўляецца мастацкім дакументам часу, пішуць літаратурныя крытыкі, гісторыкі літаратуры, выходзяць у свет яго творы без усялякай цэнзуры. І перавыдаюцца аповесці нашага знакамітага суайчынніка ў перакладзе на іншыя мовы.

Вельмі сімпатычным падаецца зборнік «Аповесці» Васіля Быкава, які ўбачыў свет у выдавецтве «Речь» (Санкт-Пецярбург) у серыі «Классика Речи». Разам да чытача прыйшлі «Сотнікаў», «Абеліск», «Дажыць да світання», «Пайсці і не вярнуцца». Як на сённяшні час, уражвае і досыць высокі тыраж цудоўна афармленага ў паліграфічным плане выдання — 4500 экзэмпляраў. Зборнік ілюструюць выразныя, лаканічныя і разам з тым багатыя па змесце графічныя працы народнага мастака Савецкага Саюза і Беларусі Георгія Паплаўскага.

У канцы зборніка — артыкул літаратурнага крытыка, гісторыка літаратуры Сяргея Шапрана «Там, дзе праўда». Ён пачынаецца такімі словамі другога знакамітага і аўтырытэтнага расійскага даследчыка прозы народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава — Ігара Дзядкова: «Амаль невытлумачальна, чаму — праўда. Чаму ў Быкава заўсёды — праўда?». Дарэчы, кніга, якую некалі напісаў Дзядкоў пра Васіля Быкава, носіць такую назву — «Аповесць пра чалавека, які выстаяў».

Шэрагі мільёнаў аматараў творчасці Васіля Быкава, відавочна, і сёння дадаюцца новымі ўважлівымі чытачамі. Няхай сабе і толькі тысячы з іх адкрываюць папяровыя кнігі класіка беларускай, класіка сусветнай мастацкай літаратуры. Але і ў гэтым — сведчанне ўвагі да беларускай літаратуры. Найперш — да літаратуры, напісанай беларусамі пра Вялікую Айчынную. У Расіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, іншых краінах выходзяць кнігі, друкуюцца ў перыядычных выданнях аповесці, апавяданні не толькі Васіля Быкава, але і Алеся Адамовіча, Алены Брава, Уладзіміра Саламахі. Прыклады можна доўжыць.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

■ Быць добрым проста

# СЛУХАЮЧЫ ЛІТАРАТУРУ

## Аўдыякнігі ад PRASTORA.BY атрымалі дзеці са слабым зрокам

**Беларускамоўныя аўдыякнігі займелі новага слухача. У межах дабрачыннай акцыі «Дорым радасць!» яны трапілі да дзяцей са слабым зрокам. Гэта стала магчымым дзякуючы ініцыятыве сацыяльна-культурнай установы «МоцАрт», якая займаецца пашырэннем беларускай культуры і так званай інклюзіяй — рэалізуе сацыяльныя і дабрачынныя праекты, накіраваныя на людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама культурніцкай пляцоўцы «Прастора бай», дзе былі выпушчаны аўдыякнігі і падрыхтавана адметная забаўляльна-адукацыйная праграма.**



Падчас дабрачыннай акцыі «Дорым радасць!» у Маладзечанскай спецыяльнай школе для дзяцей з парушэннямі зроку.

Навучэнцы дзвюх спецыялізаваных школ — Маладзечанскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната № 2 для дзяцей з парушэннямі зроку і Спецыяльнай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 188 горада Мінска для дзяцей з парушэннямі зроку — атрымалі ў падарунак камплекты з аўдыякнігамі. Кожны вучань займеў па пяць запісаў, спецыяльна падабраных пад яго ўзрост, а таксама паштоўку з тэкстам для бацькоў пра важнасць вывучэння беларускай мовы і літаратуры і пакунак з цукеркамі ды гарбатай. Усе карысныя цікавінкі былі складзены ў прыгожыя льняныя торбачкі з арнаментам і надпісам «Беларусь».

Уручэнне падарункаў адбывалася падчас святочных мерапрыемстваў і суправаджалася лекцыямі і майстар-класамі па беларускіх традыцыйных музычных інструментах, выступленнем дудара, рыцарскім боем, выстаўкай і гістарычнымі расказамі пра беларускае ўзбраенне розных эпох.

Амаль на дзве гадзіны дзеці здзяйснялі віртуальнае падарожжа ў Сярэднявечча — у часы гераічных баталій, адвагі і мужнасці — і такое тут бачылі ўпершыню. **Гісторык, заснавальнік народнага тэатра гістарычнай рэканструкцыі «Полацкі звяз» Юрый УСЦІНОВІЧ**, які разам з паплечнікамі дэманстраваў дзецям элементы сярэднявечнага ўзбраення, расказаў:

— У нас ёсць розныя сярэднявечныя забаўкі, спецыяльна для гэтага прадугледжаныя. Мы паказваем і даём магчымасць паспрабаваць, як у даўнія часы продкі адточвалі свой спрыт і бавілі вольны час. Ёсць розныя атракцыёны, дзе можна пастраляць з лука, пакідаць сякеры — усё гэта суправаджаецца аповедамі і гістарычнымі даведкамі. Убачыўшы і адчуўшы такое на сабе, дзеці пачынаюць па-іншаму ўспрымаць гісторыю.

Школьнікі мелі магчымасць задаваць пытанні, дакранацца да даспехаў, зробленых на ўзор старажытных, і нават прымяраць іх, таксама як і паспрабаваць сябе ў ролі музыкаў, зайграўшы на дудзе або жалейцы. Такім чынам, беларуская культура і традыцыі сталі да іх на крок бліжэй.

**Алесь КВІТКЕВІЧ, кіраўнік кампаніі «Прастора бай»**, дзе былі запісаныя аўдыякнігі, растлумачыў:

— Мы адчуваем неверагодны плён ад гэтай акцыі. І ў першую чаргу мяркуем па тым, як жыва дзеці рэагуюць на тое, што адбываецца на сцэне і побач з ёй, калі разгортваецца адмысловая выстаўка. Для іх гэта сапраўды цікава! Па заканчэнні імпрэзы нават утварылася чарга, прычым як хлопчыкаў, так і дзяўчат, каб прымераць на сябе даспехі. Дзеці з вялікай ахвотай імкнуліся патрымаць меч, дзіду, іншыя сярэднявечныя прылады, абступалі дудара і яго інструменты. Як вучні, так і настаўнікі казалі, што такога ў іх яшчэ не было. І запрашалі прыязджаць яшчэ, прывозячы да іх беларускую культуру ў такім жывым фармаце. Безумоўна, па меры магчымасці мы будзем імкнуцца гэта рабіць. Найпершая ж нашая задача — даехаць туды, дзе мы яшчэ не былі. Мы правялі імпрэзы ў дзвюх навучальных установах, а ў краіне яшчэ чатыры такія спецыялізаваныя школы і адзінаццаць дзіцячых садкоў для дзяцей з парушэннямі зроку. І цяпер мы збіраем неабходныя рэсурсы, плануем наведаць усе такія спецыялізаваныя ўстановы. Будзем вельмі рады, калі да нас далучацца тыя, хто, як і мы, бачыць сэнс у такога рода асветніцкай дзейнасці. Мы і самі будзем працягваць пошукі такіх людзей, праводзіць сустрэчы з людзьмі з бізнесу, знаходзячы сярод іх аднадумцаў, разам з якімі зможам працягнуць дадзеную дабрачынную акцыю з адукацыйнай місіяй.

Варта дадаць, што сярод «гукавых» кніг, якія падарылі самым юным слухачам, былі беларускія народныя і аўтарскія казкі, аўдыяспектаклі і песні для дзяцей малодшага ўзросту, творы Янкі Маўра «Палескія рабінзоны» і «У краіне райскай птушкі». Старэйшыя школьнікі атрымалі магчымасць пачуць такія творы Уладзіміра Караткевіча, як «Каласы пад сярпом тваім», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі», зборнік вершаў «Быў. Ёсць. Буду», а таксама творы Івана Мележа «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Дзве душы» Максіма Гарэцкага, паэтычную спадчыну Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча ды многае іншае.

Алесь Квіткевіч адзначае, што ў цэлым попыт на аўдыякнігі цяпер павялічваецца. Шмат хто любіць слухаць іх у машыне — асабліва падчас доўгіх падарожжаў — ці проста едучы ў грамадскім транспарце. Хтосьці, робячы хатнія справы, слухае літаратуру замест музыкі. Ёсць людзі, якім проста зручней слухаць, чым чытаць. Вялікую цікавасць да беларускай літаратуры ў аўдыяфармаце праяўляюць таксама нашы суайчыннікі з-за мяжы. Для іх гэта асабліва актуальна, бо яны часцяком не маюць магчымасці чуць родную мову ў сваім асяроддзі. І тады аўдыякніга прыходзіць ім на дапамогу. У выніку слухачы і аматары жывога беларускага слова часта звяртаюцца ў «Прастору бай» з пытаннем, калі выйдуць новыя творы ў запісе? Таму ў гэтай культурніцкай прасторы задумваюцца над тым, каб увесці падпіску на аўдыякнігі, што будзе вельмі зручна для многіх.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Запрашальнік

# ДЗЕ ЖЫВЕШ? ДАВЕДАЙСЯ БОЛЬШ!

**Па ініцыятыве ЮНЕСКА ва ўсім свеце адзначылі міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін. У Беларусі гэта знакавая дата мае адметны працяг. У гэтыя выхадныя — 21—22 красавіка — праходзіць Фэст экскурсаводаў. А значыць, з'яўляецца ўнікальная магчымасць абсалютна бясплатна наведаць цікавыя вандроўкі і пачуць адметныя расказы ў сваёй мясцовасці (ці за яе межамі). Дзякуючы насычанай праграме хтосьці, магчыма, даведаецца нешта новае пра гісторыю малой радзімы.**

Арганізатары фэсту звяртаюць увагу, што кожны дзень, ідучы на працу ці заняткі, мы абмінаем унікальныя помнікі культуры, архітэктуры, прыроды і нават не здагадваемся пра гэта. Таму з дапамогай Фэсту экскурсаводаў ёсць магчымасць па-іншаму зірнуць на штодзённыя рэчы і перамяніць сваё стаўленне да спадчыны. Падчас вандровак гіды і краязнаўцы звернуць увагу наведвальнікаў не толькі на велічныя замкі і манументальныя палацы, але і на дарагія сэрцу невялікія дамкі, заняпалыя сядзібы — усё, што стварае непаўторнасць роднага краю.

У межах фэсту запланаваны самыя разнастайныя дзіцячыя, літаратурныя, веласіпедныя, анімаваныя экскурсіі, квэсты. Адбудуцца вандроўкі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Запланаваны некаторыя імпрэзы і майстар-класы. Дарэчы, азнаёміцца з поўным спісам экскурсій і запісацца можна на сайце festguides.by.

**Каардынатар Фэсту экскурсаводаў — 2018 Павел КАРАЛЁЎ** адзначае:

— Часта людзі жывуць у пэўным месцы і проста не ведаюць таго, што знаходзіцца побач з імі. Падаецца, яны пакуль проста не сустрэлі таго, хто можа ім расказаць. Ёсць некалькі спосабаў, каб людзі даведаліся, што іх атачае, — з дапамогай экскурсаводаў і кніг. Пэўным ключом да такога знаёмства з'яўляецца і Фэст экскурсаводаў. Сёлета мы разлічваем правесці больш за 70 экскурсій па Мінску і больш за 60 экскурсій па рэгіёнах. Усе яны бясплатныя.

Цікавыя вандроўкі адбудуцца не толькі ў Беларусі, у гэтым годзе да Фэсту экскурсаводаў далучыліся і некаторыя замежныя гарады — Мадрыд, Варшава, Львоў і іншыя.

Сёлета ўпершыню ў межах свята адбудзецца інтэлектуальная гульня на тэму гісторыка-культурнай спадчыны. Стваральнікі такой забавы адзначаюць, што яна прысвечана беларускай культуры (у шырокім сэнсе слова), дзе кожны можа адпачыць душой і паварушыць мазгамі, праверыць і паглыбіць свае веды. З нагоды Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін гульня пройдзе з адмысловымі турамі, прысвечанымі гісторыі нашай краіны, помнікам, загадкам беларускіх гарадоў і мястэчак.

Арганізатарамі Фэсту экскурсаводаў — 2018 выступаюць Беларускі камітэт Міжнароднай рады па помніках і мясцінах (ICOMOS), Беларускае грамадскае аб'яднанне экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, Нацыянальнае агенцтва па турызме, Беларускі фонд культуры.



### МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

21 красавіка ў 13 гадзін пачнецца экскурсія «Гартаючы старонкі гісторыі Слуцка: архітэктурная і гістарычная спадчына». Экскурсавод Марына Міронычык пазнаёміць слухачоў з багатым гістарычным мінулым аднаго з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, у якім захаваліся помнікі архітэктуры XVII—XIX ст., а таксама нарадзіліся славутыя легендарныя жыхары. Месца пачатку: масток каля Палаца культуры (былая Замкавая горка).

21 красавіка з 10.00 да 14.00 у вёсцы **Плябань** у Маладзечанскім раёне пройдзе захапляльная гісторыка-літаратурная гульня «Канфедэратка-2018», якую падрыхтавалі Воля Сямашка, Ала Ліхтаровіч і Алесь Мазанік. Гульня прымеркавана на Дня памяці паўстанцаў 1863 г., пахаваных на могілках у в. Плябань. Дадаткова запланаваны сюрпрызы і паўстанцкі стол. Збор удзельнікаў каля магілы паўстанцаў.

21 красавіка ў 14.00 у аг. **Пясочнае** адбудзецца экскурсія «Электрычны чалавек»: погляд у мінулае сядзібы Наднёман і яе гаспадара Якуба Наркевіча-Ёдкі». Краязнаўца Генадзь Ермак раскажа, як пан Якуб, празваны ў народзе «электрычным чалавекам», прыспешваючы свае думкі, стварыў фантастычную лабараторыю электраграфіі... Месца вялікіх адкрыццяў вучонага Наркевіча-Ёдкі ў XIX стагоддзі, дзе ён пражыў самыя шчаслівыя хвіліны свайго жыцця. Месца пачатку: брама ў в. Наднёман Уздзенскага раёна (магчыма, па ўзгадненні з ахвотнымі, з аўтавакзала горада Узда).

21 красавіка ў 11.00 у Стоўбцах пройдзе экскурсія «**Стоўбцы** як першая станцыя Заходняй Еўропы». Канстанцін Нашчынец раскажа пра цікавыя і захапляльныя, а таксама малавядомыя старонкі гісторыі чыгуначнай станцыі ў Стоўбцах, росквіт кантрабанды, шпіянаж, а таксама пазнаёміць з вядомымі панамі і паненкамі ў невялічкім мястэчку. Месца пачатку: чыгуначная станцыя Стоўбцы.

21 красавіка ў 18.30 ахвотныя змогуць здзейсніць рамантычны шпацыр па «Маленькім Парыжы» — менавіта так экскурсавод Кацярына Казлова называе **Нясвіж**. Які ён, Нясвіж другой паловы XIX стагоддзя? Што стала прычынай аднаўлення «самай шляхетнай рэзідэнцыі»? Месца пачатку: Нясвіжскі замак. Перад уваходам у замак экскурсія па парку.

Даведацца пра «Пухавіцкія цікавосткі» запрашае Наталля Ільініч 21 красавіка ў 12.00. Экскурсанты наведаюць цікавыя мясціны ў г. **Мар'іна Горка** (урочышча Мар'іна Гара на беразе Цітаўкі, сядзібны дом Макава, касцёл Святога Антонія, царкву А. Неўскага), пераедуць у Блонь, дзе агледзяць Траецкую царкву і дом Бонч-Асмалоўскіх, потым накіруюцца на Папову Горку — месца гібелі пухавіцкіх яўрэяў. Канцавы пункт — мястэчка Пухавічы, дзе захавалася забудова сярэдзіны XX ст. і рэшткі яўрэйскіх могілак. Месца пачатку: чыгуначны вакзал у Пухавічах.

22 красавіка ў 11.00 Наталля Ільініч запрашае на веласіпедную экскурсію «**Талька** і наваколлі». Да ўвагі экскурсантаў — мястэчка Талька, Коласавы мясціны, крыніца Кіпячка ці Сарафінава гара — месца касцёла Святога Антонія. Месца пачатку: чыгуначная станцыя Талька.

Настасся Сярболіна 21 красавіка ў 12.00 прапануе наведаць «Фальварак **Ракуцёўшчына** — мясціну натхнення Максіма Багдановіча». Падчас экскурсіі можна будзе не толькі пазнаёміцца з жыццём і творчасцю М. Багдановіча, але і даведацца аб тым, які ўплыў на творчасць паэта зрабіла паездка на Радзіму. Месца пачатку: каля ўвахода ў сядзібу.

«У госці да мінскага ваяводы» ў в. **Сёмкава** 22 красавіка ў 11.00 запрашае Настасся Пяргаева. Экскурсанты наведаюць палацава-паркавы комплекс у Сёмкаве, убачаць унікальную памятную пліту ў гонар бацькоў апошняга мінскага ваяводы Адама Хмары. Месца пачатку: уваходная брама сядзібы ў Сёмкаве.

### ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

21 красавіка ў 11.30 Ганна Свістун прапануе экскурсію «**Ізабелін**: вандроўка ў мінулае, цяперашняе і будучае». Усе ахвотныя здзейсняць гісторыка-краязнаўчы экскурс у мінулае ізабелінскага краю: наведаюць касцёл Святых Пятра і Паўла, храм Святога Архангела Міхаіла, сустрэнуцца са святарамі. Месца пачатку: Ізабелінская сельская бібліятэка.

### ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

21 красавіка ў 16.00 краязнавец Яўген Малікаў запрашае наведаць экскурсію «Кімбараўскі мужчынскі кляштар ордэна цыстэрцаў у **Мазыры**: невядомыя аскепкі былой барочнай велічы». Наведвальнікі пашпацыруюць па будынках былога Кімбараўскага цыстэрскага мужчынскага кляштара, узведзенага ў стылі барока. Месца пачатку: г. Мазыр, вул. Гогаля, 61.

21 красавіка ў 13.30 у г. п. **Красны Бераг** гід Марыя Ткачова правядзе экскурсію «Жамчужына Гомельшчыны». Цягам экскурсіі можна будзе пазнаёміцца з сядзібным домам XIX стагоддзя Козел-Паклеўскіх, гісторыяй сям'і ўладальнікаў, побытам дваран. Месца пачатку: Красны Бераг, вул. Ісаева, 14, сядзібны дом XIX стагоддзя Козел-Паклеўскіх.

### БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

22 красавіка ў 11 гадзін адбудзецца экскурсія «Пінск. Гісторыя ў асобах» ад Таццяны Хвагінай. Вандроўка пройдзе па тых раёнах і вуліцах Пінска, якія не ўваходзяць у традыцыйныя маршруты гарадскіх экскурсій. Удзельнікі даведаюцца пра асоб, у гонар якіх названыя вуліцы горада, а таксама пра тое, як **Пінск** звязаны з каралевай Бонай, Альбрэхтам Радзівілам, Адамам Нарушэвічам і многімі іншымі. Месца пачатку: плошча Леніна, насупраць увахода ў Музей Беларускага Палесся.

### МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

22 красавіка ў 11.00 Дар'я Эверс запрашае ў «Падарожжа па малой Радзіме» ў вёску **Судзілы** Клімавіцкага раёна. Падчас экскурсіі ёсць магчымасць даведацца пра гісторыю в. Судзілы, пра лёс царквы і сельскай школы, жыццё баброў на рацэ Лабжанка. У праграме — майстар-клас па вырабе паясоў, валёнкаў і знаёмства з пчальнікам. Месца пачатку: в. Судзілы, вул. Садовая, каля будынка крамы.

Пра «Жамчужыну г. Клімавічы» 21 красавіка ў 11.00 раскажа Наталля Банышэўская. Размова пойдзе пра гісторыю ўзнікнення гарадскога парку, якому каля 150 гадоў. Месца пачатку: г. **Клімавічы**, вул. Савецкая, 69.

Ніна Сакава запрашае наведаць вёску **Свіслач** у Асіповіцкім раёне. Экскурсія з гучнай назвай «Свіслач як цэнтр гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі» адбудзецца 22 красавіка ў 11.00. Наведвальнікі ўбачаць Свіслач як гарадзішча, сярэднявечны горад, мястэчка, пазнаёмяцца з архітэктурай былой Свіслачы і даведаюцца пра адміністрацыйнае прызначэнне населенага пункта як цэнтра (княства, воласць, райцэнтр). Месца пачатку: Свіслацкае гарадзішча.

21 красавіка ў в. **Сычкава** Бабруйскага раёна ў 13.00 пройдзе «Экскурсія па залах музея, а таксама на месцы подзвігу М. Р. Селязнёва». Падчас яе Фёдар Алёхна пазнаёміць прысутных з экспазіцыйнымі заламі музея, а таксама правядзе да месца подзвігу героя Савецкага Саюза М. Р. Селязнёва, брацкай магілы, мемарыяльнага помніка «Курган Славы». Месца пачатку: Бабруйскі р-н, в. Сычкава, вул. Селязнёва, д. 16.

### ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Квэст-экскурсія «Жывыя вуліцы» ад Ганны Лісейцавай пройдзе ў аг. **Акцябрская** 21 красавіка ў 10.00. Рухаючыся па маршрутным лісце, удзельнікі праходзяць розныя выпрабаванні і даведваюцца гісторыю аграгарадка. На кожным кантрольным «пункце» выконваюць заданні, якія праводзяць памочнікі, што сустракаюць гульцоў. За выкананне кожнага задання каманда атрымлівае фрагмент карты, якая дапаможа знайсці галоўны прыз. Месца пачатку: аг. Акцябрская, вул. Сонечная, 1а.

Яшчэ адна квэст-экскурсія «Уздоўж Лужаснянкі» ад Андрэя Струнчанкі пройдзе ў аг. **Мазалава** (пачнецца 22 красавіка ў 10.00). Гэта будзе квэст-экскурсія па мясцінах аграгарадка, звязаных з жыццём і дзейнасцю дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Віцебшчыны Ігната Манькоўскага, па мясцінах, дзе праходзілі здымкі кінафільма «Чорная бяроза» і іншых. Месца пачатку: мазалаўская сярэдняя школа.

21 красавіка ў 11.00 Ігар Пракаповіч запрашае ў вандроўку «**Паставы** — сталіца чароўнага краю». Месца пачатку: плошча, каля помніка Леніну.

**Падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

УТВЕРЖДЕНО
Решение Общего собрания участников Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС»
2 апреля 2018 г. № 6/н

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспекты эмиссии жилищных облигаций пятого, шестого и восьмого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (правопреемник – ООО «ТАПАС»)

1. Пункт 1.11. Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

**«1.11. Исполнительный орган эмитента, размер доли в процентах в уставном фонде эмитента.**

Директор – Сидоренко Андрей Анатольевич, действующий на основании Устава.

Доли в уставном фонде Эмитента, а также в зависимых хозяйственных обществах Эмитента не имеет.».

| | |
|---|---|
| Директор Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» | А. А. Сидоренко |
| Главный бухгалтер Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» | И. А. Голубь |

УНП 101484246

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Березинский льнозавод» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**Лот № 1:** главный производственный корпус, общей площадью 3765,8 кв. м, инв. № 611/С-32465, расположенный на земельном участке площадью 1,5960 га с кадастровым номером 620450100001003603 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 1.

Начальная цена с НДС (20 %) – 428 688,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (21 434,40 бел. руб.).

**Лот № 2:** административно-бытовой корпус, общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – 196 259,70 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (9 812,98 бел. руб.).

**Лот № 3:** склад-арочник, общей площадью 772 кв. м, инв. № 611/С-32657, расположенный на земельном участке площадью 0,1541 га с кадастровым номером 620450100001003594 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 4.

Начальная цена с НДС (20 %) – 94 452,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (4 722,60 бел. руб.).

**Лот № 4:** склад-арочник, общей площадью 651,7 кв. м, инв. № 611/С-32658, расположенный на земельном участке площадью 0,1659 га с кадастровым номером 620450100001003595 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 3.

Начальная цена с НДС (20 %) – 73 554,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (3 677,70 бел. руб.).

**Лот № 5:** здание боксов, общей площадью 347,6 кв. м, инв. № 611/С-32656, расположенное на земельном участке площадью 0,0657 га с кадастровым номером 620450100001003593 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 5.

Начальная цена с НДС (20 %) – 31 170,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (1 558,50 бел. руб.).

**Лот № 6:** здание котельной, общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастросборник, общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – 130 872,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (6 543,60 бел. руб.).

**Лот № 7:** автовесовая, общей площадью 193,2 кв. м, инв. № 611/С-32800, расположенная на земельном участке площадью 0,0435 га с кадастровым номером 620450100001003598 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 10.

Начальная цена с НДС (20 %) – 31 896,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (1 594,80 бел. руб.).

**Лот № 8:** блок вспомогательных помещений, общей площадью 515,2 кв. м, инв. № 611/С-32646 и навесной склад, общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенные на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – 110 790,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (5 539,50 бел. руб.).

**Лот № 9:** насосная станция 2-го подъема, общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – 37 662,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (1 883,10 бел. руб.).

**Лот № 10:** шоха № 1, общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2, общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение, общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенное по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – 318 042,00 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены (15 902,10 бел. руб.).

**Стоимость лотов снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **30.05.2018** в **15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.05.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**ЗАСО «Промтрансинвест»** предлагает принять участие в процедуре закупки № 2018-562545, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Компьютеры/оборудование > Другое».

УНП 100357923

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 80 % после очередных несостоявшихся торгов по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому дочернему унитарному предприятию «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт» на праве хозяйственного ведения

| № лота | Наименование объекта | Инв. номер | Начальная цена, руб. (без НДС) | Задаток, руб. (без НДС) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Агрегат электронасосный АЦНСН 315-189 с эл.дв. 160 кВт | 14520 | 10 893,54 | 544,68 |
| 2 | Агрегат электронасосный АЦНСН 315-189 с эл.дв. 160 кВт | 14521 | 10 893,54 | 544,68 |
| 3 | Агрегат электронасосный ЛДН 900-60 с эл. дв. 200 кВт | 14516 | 11 525,61 | 576,28 |
| 4 | Агрегат электронасосный ЛДН 900-60 с эл. дв. 200 кВт | 14517 | 11 525,61 | 576,28 |
| 5 | Агрегат электронасосный ЛДН 900-60 с эл. дв. 200 кВт | 14518 | 11 525,61 | 576,28 |
| 6 | Задвижка клиновая ФЛ.30С541 НЖ ДУ 700 РУ16 с КОФ КЛА ИСП. 2/3 | 14514 | 3 343,04 | 167,15 |
| 7 | Задвижка клиновая ФЛ.30С541 НЖ ДУ 700 РУ16 с КОФ КЛА ИСП. 2/3 | 14515 | 3 343,04 | 167,15 |

Местонахождение имущества: Брестская обл., Брестский р-н, Страдечский с/с, 20, 1,3 км северо-восточнее н. п. Прилуки

Аукцион состоится 3 мая 2018 г. по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23. Начало в 11.00.
Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 2 мая 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 11.00 **3 мая 2018 г**. Участник торгов, желающий участвовать в торгах в отношении нескольких предметов торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов торгов. Шаг аукциона – 5 %.
Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.
Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**К заявлению на участие в аукционе прилагаются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора торгов, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или трудовой договор (контракт), или иные документы в соответствии с законодательством). В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с № BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №__** согласно извещению в газете «Звязда» от 21 апреля 2018 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), будет засчитан в счет окончательной стоимости предмета торгов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется перед началом аукциона; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов; в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.
Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет десять базовых величин за каждый случай нарушения.
Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по вышеуказанным лотам были опубликованы в газете «Звязда» от 11.01.2017 г. № 6, от 30.03.2017 г. № 60, от 15.04.2017 г. № 72, от 03.04.2018 № 63

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»,
г. Гомель, ул. Артема, 23. 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by
Продавец: РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт», г. Брест,
ул. Героев обороны Брестской крепости, 13. 8 (0162) 27-08-31, 8 (029) 797-50-00**

## «К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БелВитунифарм»

Внеочередное собрание акционеров состоится 10 мая 2018 года в 12.00 по адресу: Витебский район, дер. Должа, ул. Советская, д. 26А, актовый зал. Регистрация участников будет осуществляться по указанному выше адресу, время регистрации участников собрания пройдет в день проведения собрания с 09.00 до 11.45. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2018 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

| | |
|---|---|
| 1. | О создании торгового унитарного предприятия Общества |
| 2. | О принятии устава Общества в новой редакции |

С материалами внеочередного собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 2 мая 2018 г., по месту нахождения Общества в кабинете начальника отдела правовой и кадровой работы с 08.00 до 16.00.

Наблюдательный совет ОАО «БелВитунифарм». Тел. 8 0212 209390.

УНП 811001710

## Объявление о повторных торгах

| Лоты № | Наименование имущества | Количество, мера, вес | Итоговая стоимость |
|---|---|---|---|
| 1 | Реактор DGM для приготовления питательных сред инактивных V1000 л. | 1 | 5428,80 бел. руб. |
| 2 | Реактор DGM для смешивания монокультур лептоспироза V1000 л. | 1 | 5420,70 бел. руб. |
| 3 | Реактор DGM для инактивации. V1000 л. | 1 | 5420,70 бел. руб. |
| 4 | Устройство для просмотра флаконов (мод. SBINS-100) | 1 | 1529,10 бел. руб. |
| 5 | Резервуар смеситель для растворения ингредиентов 10 л. | 1 | 48,60 бел. руб. |
| 6 | Промежуточная напорная емкость 10 л. | 1 | 25,20 бел. руб. |
| 7 | Промежуточная напорная емкость 10 л. | 1 | 25,20 бел. руб. |
| 8 | Промежуточная напорная емкость 5 л. | 1 | 15,30 бел. руб. |
| 9 | Промежуточная напорная емкость 5 л. | 1 | 15,30 бел. руб. |
| 10 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 11 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 12 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 13 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 14 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 15 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 16 | Промежуточная напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 44,10 бел. руб. |
| 17 | Напорная емкость, вместимость 20 л. | 1 | 43,20 бел. руб. |
| 18 | Напорная емкость, вместимость 100 л. | 1 | 193,50 бел. руб. |
| 19 | Напорная емкость, вместимость 20 л. | 1 | 43,20 бел. руб. |
| 20 | Напорная емкость, вместимость 20 л. | 1 | 43,20 бел. руб. |
| 21 | Напорная емкость, вместимость 20 л. | 1 | 43,20 бел. руб. |
| 22 | Напорная емкость, вместимость 50 л. | 1 | 99,90 бел. руб. |
| 23 | Установка для мойки и стерилизации оборудования CIP/SIP | 1 | 6041,17 бел. руб. |
| 24 | Ферментер для выращивания культур клеток в асептических условиях BMR-K450U, 50 л. | 1 | 324 бел. руб. |
| 25 | Ферментер для выращивания культур клеток в асептических условиях BMR-K70U, 300 л. | 1 | 1979,10 бел. руб. |
| 26 | Ферментер для выращивания культур клеток в асептических условиях BMR-K10U, 7 л. | 1 | 38,70 бел. руб. |
| 27 | Сборник DGM для фильтрации MSJ-100 | 1 | 235,80 бел. руб. |
| 28 | Установка для мойки SIP | 1 | 13458,60 бел. руб. |
| 29 | Машина для маркировки ампул YZ 5/10 | 1 | 60316,20 бел. руб. |
| 30 | Атомно-абсорбционный спектрометр | 1 | 48,60 бел. руб. |
| 31 | Лиофильная сушка Alpha I-4 | 1 | 10495,80 бел. руб. |
| 32 | Шкаф сушильный вакуумный электрический | 1 | 254,70 бел. руб. |

| | |
|---|---|
| Собственник (владелец) имущества | Витебская область. Право собственности: ОАО "Белвитунифарм" (Витебский район, д. Должа, ул. Советская, д. 26А), УНП 811001710 |
| Местонахождение имущества | г. Витебск. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО "Белвитунифарм" – Большакову Сергею Александровичу (т. р. 80212-20-94-10) |
| Наличие обременений | Не имеет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения Витебского района, г. Витебск, ул. Кирова, д. 7/13, каб. 6. 25 мая 2018 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Витебского района, г. Витебск, ул. Кирова, д. 7/13. Начальник отдела Колядко Александр Михайлович, тел. (80212-64-71-29, тел. моб. 375 33 687-88-64, эл. почта opi208@minjust.by) |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района № BY60 AKBB 3642 9030 0266 1200 0000 в филиале № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, код банка AKBBBY21200, УНП 300002505, с пометкой за лот № (1-32) ОАО «БелВитунифарм» не позднее 14.00 24 мая 2018 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5 % от стоимости лота. В соответствии со ст. 97 Закона Республики Беларусь "Об исполнительном производстве" возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2018
## ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»

| Активы | Код стр. | На 31 декабря 2017 г. | На 31 декабря 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 96 966 | 104 391 |
| Нематериальные активы | 120 | 2 082 | 2 424 |
| **Доходные вложения в материальные активы** | **130** | **6 843** | **7 973** |
| В том числе: | | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | 6 843 | 7 973 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 24 937 | 20 727 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 74 564 | 41 154 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 23 | 29 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 119 | 12 702 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **205 534** | **189 400** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 45 450 | 45 899 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 19 996 | 21 885 |
| незавершенное производство | 213 | 9 249 | 9 502 |
| готовая продукция и товары | 214 | 16 205 | 14 512 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 7 774 | 795 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 508 | 1 080 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 154 170 | 92 909 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 5 734 | 3 925 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 3 252 | 798 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **216 888** | **145 406** |
| **БАЛАНС** | **300** | **422 422** | **334 806** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 117 378 | 117 378 |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | (2) | (2) |
| Резервный капитал | 440 | 1 238 | 1 238 |
| Добавочный капитал | 450 | 32 448 | 32 448 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (14 532) | (18 884) |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **136 530** | **132 178** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 141 019 | 115 880 |
| Доходы будущих периодов | 540 | 264 | 3 193 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **141 283** | **119 073** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 34 343 | 45 157 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 66 768 | - |
| **Краткосрочная кредиторская задолженность** | **630** | **43 463** | **38 367** |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 24 367 | 15 676 |
| по авансам полученным | 632 | 7 833 | 12 422 |
| по налогам и сборам | 633 | 1 047 | 551 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 595 | 364 |
| по оплате труда | 635 | 1 785 | 1 569 |
| прочим кредиторам | 638 | 7 836 | 7 785 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 35 | 31 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **144 609** | **83 555** |
| **БАЛАНС** | **700** | **422 422** | **334 806** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| Наименование показателей | Код стр. | За январь – декабрь 2017 г. | За январь – декабрь 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 188 471 | 171 813 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (170 428) | (132 518) |
| **Валовая прибыль** | **030** | **18 043** | **39 295** |
| Управленческие расходы | 040 | (11 839) | (8 904) |
